Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
12 МАЯ 2018 г. СУБОТА № 89 (28705)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## НЕАД'ЕМНЫЯ СІМВАЛЫ СУВЕРЭННАЙ БЕЛАРУСІ

*Дарагія суайчыннікі!*

Ад усёй душы віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Сёння мы падкрэсліваем значнасць гэтых неад'емных сімвалаў суверэннай Беларусі, напоўненых доблесцю і гераізмам. Усведамляем іх глыбокую гістарычную ролю ў захаванні грамадскай згоды на беларускай зямлі.

Грамадзянам, якія ведаюць і паважаюць нацыянальныя каштоўнасці, пад сілу зрабіць Айчыну працвітаючай. Прыемна, што цяперашняе пакаленне беларусаў сваёй плённай працай разам стварае навейшую гісторыю нашай краіны, з гонарам прадаўжаючы слаўныя традыцыі мінулага.

Герб, сцяг і гімн — гэта не проста сімволіка, а візітная картка міралюбівай палітыкі Рэспублікі Беларусь, чый аўтарытэт бясспрэчна прызнаны на міжнароднай арэне.

У гэты знамянальны дзень сардэчна жадаю вам, дарагія суграмадзяне, шчасця, невычэрпнай энергіі, жыццёвага аптымізму і новых дасягненняў на карысць любімай Радзімы.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Больш за 90**

*навукова-тэхнічных і інавацыйных распрацовак будзе прадстаўлена на XXV Міжнародным форуме па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБО-2018», які пройдзе ў Мінску 14—18 мая. Распрацоўкі будуць прэзентаваны на калектыўным стэндзе ДКНТ. Са сваімі дасягненнямі і праектамі азнаёмяць установы і арганізацыі Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук і Беларускага інавацыйнага фонду. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі прадставіць 15 экспанатаў, у прыватнасці шматузроўневую сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, Беларускі інавацыйны фонд прэзентуе праекты пераможцаў і фіналістаў рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў у сферы інфармацыйных тэхналогій і прыборабудавання. Сярод іх будзе кішэнны робат PocketBot — інтэлектуальны аўтаномны мабільны робат, бартавы камп'ютар для ўсталявання на сельскагаспадарчую тэхніку і інш.*

ISSN 1990 - 763X

# Справа — на вышыні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар Хойнікаў Віктар ЦЯРЭШЧАНКА рамантуе комін на даху свайго дома.

■ У лічбавым фармаце

## СТВАРАЕМ IT-КРАІНУ РАЗАМ

### Міністр сувязі і інфарматызацыі расказаў пра будучыню інфармацыйных тэхналогій

**У 25-м міжнародным форуме «ТІБО-2018», які распачнецца ў панядзелак, прымуць удзел кампаніі з 15 дзяржаў. Пра гэта паведаміў міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ. Падчас мерапрыемства, якое будзе праходзіць з 14 да 18 мая, апошнія дасягненні нашай краіны прадставяць стэндам «IT-краіна Беларусь». Таксама міністр расказаў пра тое, як у нас плануюць выкарыстоўваць тэхналогіі 5G, аб падрыхтоўцы да правядзення Еўрагульняў-2019 і як вырашаецца пытанне адмены роўмінгу з Расіяй.**

### Айчынныя аператары рыхтуюцца да 5G

Сяргей Папкоў адзначыў, што ахоп насельніцтва паслугамі сотавай сувязі LTE у краіне зараз складае 74,5 %. Колькасць базавых станцый перавысіла тысячу. Выкарыстоўваць фармат 4G сёння можна ў 455 населеных пунктах краіны.

«Адносна фармату 5G, мы чакаем, што ў канцы года ў свеце выйдуць стандарты гэтай тэхналогіі. Нашы аператары тэхналагічна гатовыя іх укараняць. Поле для гэтага даволі шырокае», — адзначыў Сяргей Папкоў.

Праз некалькі гадоў пятае пакаленне мабільнай сувязі будзе найбольш актуальнае для камерцыйнага выкарыстання. Гаворка ідзе аб прамысловым інтэрнэце, тэхналогіях штучнага інтэлекту, дапоўненай рэальнасці, рабатызаваных вытворчасцяў, далейшым развіцці інтэрнэту рэчаў.

«Акрамя таго, да канца 2020 года завершым тэхналагічную мадэрнізацыю паслуг, якія аказвае Белпошта. Гэта ў першую чаргу датычыцца інтэрнэт-гандлю, лагістыкі, мадэрнізацыі розных тэхналагічных сетак», — дадаў міністр падчас прэс-канферэнцыі ў БелТА.

Канцэпцыя развіцця Белпошты на 2017—2020 гады прадугледжвае, што акрамя традыцыйных паслуг плануецца аказваць насельніцтву дзяржаўныя электронныя паслугі, некаторыя паслугі банкаў у сельскай мясцовасці. Інтэрнэт-гандаль будуць развіваць як у галіне дастаўкі тавараў поштай, так і ў прасоўванні беларускіх тавараў унутры краіны і за мяжой праз інтэрнэт-крамы Белпошты.

СТАР. 2

■ Спецыяльны рэпартаж

## Анёл у белым халаце

### Як сястра міласэрнасці 15 гадоў даглядае адзінокіх старых



**«Сёння да трох гадзін ночы не спала, хвалявалася перад інтэрв'ю», — прызнаецца пры сустрэчы сястра міласэрнасці Іна ДАЎГУЛЕВІЧ. Нераўнадушна яна ставіцца і да сваёй работы. Былая акушэрка, 15 гадоў таму яна прыйшла ў Дарожную арганізацыю Беларускай чыгункі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Штодзень Іну чакаюць у мінскіх кватэрах адзінокія старыя. Яна мерае ім ціск, прыносіць прадукты і лекі, праціраe пролежні, ходзіць да тэрапеўта па рэцэпты, прыбірае, гатуе, стрыжэ, голіць, мые, корміць катоў... За сваю працу сястра атрымлівае 500 рублёў у месяц — гэта з даплатай за паўтары стаўкі і пашыраную зону абслугоўвання. Сціпла жыве ў аднапакаёвай кватэры разам з мужам і двума сынамі і ведае, што шчасце — у блізкіх людзях побач.**

### «НАМ ТАКІЯ РУКІ ПАТРЭБНЫ»

Тое, што Іну занесла ў медыцыну, напэўна, лёс. Бо марыла яна аб іншай прафесіі — быць выхавальніцай у дзіцячым доме. Думала, што не выйдзе замуж. Пасля васьмі класаў скончыла педагагічныя курсы ў вячэрняй школе, працавала нянькай у садку, потым лабаранткай у медвучылішчы.

СТАР. 4

# Спачатку Сочы, пасля — Душанбэ

## На наступным тыдні Аляксандр Лукашэнка наведае Расійскую Федэрацыю і Рэспубліку Таджыкістан

**Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, 14 мая беларускі лідар наведае Сочы, дзе адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Там удзельнікі абмяркуюць перспектывы паглыблення ўзаемадзеяння па шэрагу напрамкаў, актуальны парадак дня і далейшае развіццё інтэграцыйнага аб'яднання.**

Акрамя таго, чакаецца сустрэча кіраўніка дзяржавы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. На ёй будуць гаварыць пра стан і перспектывы двухбаковых адносін, праблемныя пытанні, а таксама пра падрыхтоўку да пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, якое адбудзецца ў Мінску.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка накіруецца ў Рэспубліку Таджыкістан. Візіт прадоўжыцца да 16 мая.

У фармаце «сам-насам» і ў пашыраным складзе запланаваны перагаворы беларускага лідара з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам. На іх будуць разгледжаны вынікі і далейшыя планы па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, вытворчай кааперацыі, рэалізацыі сумесных праектаў і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне, а таксама работа на рынках трэціх краін, а па выніках чакаецца падпісанне двухбаковых дакументаў. Мяркуецца, што кіраўнікі краін прымуць удзел у цырымоніі адкрыцця нацыянальнай выстаўкі Беларусі ў Таджыкістане і ў шэрагу іншых мерапрыемстваў.

Дарэчы, у дні візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Душанбэ адбудзецца таджыкска-беларускі бізнес-форум, у якім прымуць удзел і прадстаўнікі дзелавых колаў Афганістана. На мерапрыемстве разгледзяць перспектыўныя напрамкі бізнес-узаемадзеяння з Таджыкістанам і Афганістанам, запланавана правядзенне кантактна-кааперацыйнай біржы паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі трох краін.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# СТВАРАЕМ ІТ-КРАІНУ РАЗАМ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сёння Беларусь — лідар па развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на тэрыторыі СНД. Сфарміраваны канкурэнтны ўнутраны рынак, на якім ліцэнзавана 338 аператараў электрасувязі. Створаны ўмовы для аказання комплексу паслуг — ад тэлефоннай сувязі, да доступу ў інтэрнэт і паслуг тэлебачання па IP-пратаколе.

## Чакаюць каля 100 кампаній на ТІБО

Сяргей Папкоў таксама паведаміў, што на Міжнародным форуме «ТІБО-2018» павінны прыняць удзел больш за 100 кампаній, што прадстаўляюць прадукцыю з 15 краін, сярод якіх Вялікабрытанія, Кітай, ЗША, Японія.

Цэнтральнай экспазіцыяй на выставе будзе стэнд «ІТ-краіна Беларусь». Тут будуць прадстаўлены інавацыйныя распрацоўкі ў сферы інфармацыйных тэхналогій дзяржорганаў і беларускіх ІТ-кампаній, рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій. Сярод удзельнікаў будуць выстаўлены аператары «Белтэлекам», МТС, velcom, beCloud, «Космас ТБ», МТІС, «Белпошта».

Сёлета на «ТІБО» прадэманструюць дасягненні ў робататэхніцы, новыя мабільныя сэрвісы і праграмы, інфармацыйныя тэхналогіі для гарадскога сектара і ЖКГ, геаінфармацыйныя і навігацыйныя тэхналогіі.

Галоўнай тэмай дзелавой праграмы стане лічбавая трансфармацыя і перспектывы лічбавай эканомікі ў Беларусі. Упершыню на мерапрыемстве пройдзе лічбавы форум ЕАЭС. Беларусь будзе пазіцыянавацца як «лічбавы мост» паміж краінамі ЕС, ЕАЭС і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна.

## Бясплатны Wi-Fi для ўдзельнікаў Еўрагульняў-2019

Па словах міністра, чакаецца, што бясплатны Wi-Fi будзе на ўсіх аб'ектах Еўрапейскіх гульняў — 2019 у Мінску. Гэта будуць у тым ліку і спартыўныя аб'екты, гасцініцы, Студэнцкая вёска на праспекце Дзяржынскага. Акрамя таго, бесперабойная сувязь будзе забяспечана і на транспартных калідорах. Для гэтага плануецца палепшыць пакрыццё 3G і 4G.

Па словах Сяргея Папкова, краіна сур'ёзна рыхтуецца да правядзення другіх Еўрагульняў. Спецыялісты ў сферы ІТ ужо вывучылі вопыт Алімпіяды ў Пхёнчхане, а таксама ўлічаць і вопыт Расіі пры правядзенні чэмпіянату свету па футболе. Пры гэтым, акрамя камунікацый, гаворка ідзе і аб забеспячэнні кібербяспекі.

## Пакуль без адмены роўмінгу з Расіяй

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі працягвае работу з Міністэрствам сувязі і масавых камунікацый Расіі па пытанні адмены роўмінгу паміж краінамі. Сяргей Папкоў адзначыў, што зараз перамовы ідуць на ўзроўні аператараў сувязі дзвюх краін. Беларускія аператары ўжо прапанавалі абанентам тарыфныя планы, якія дазволілі знізіць выдаткі ў роўмінгу — прычым не толькі ў Расіі, але і ў іншых краінах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У BANK OF AMERICA ПРАДКАЗАЛІ ВЯРТАННЕ ЦЭН НА НАФТУ ДА $100 ЗА БАРАЛЬ



У чарговым аглядзе Bank of America сказана, што цэны на нафту маркі Brent могуць часова падняцца да ўзроўню ў 90 долараў за барэль другім кварталe 2019 года, на піку дасягаючы $100 на фоне геапалітычных і іншых фактараў, перадае Bloomberg. «Гледзячы на наступныя 18 месяцаў, мы чакаем, што глабальны баланс прапановы і попыту на нафту можа зрушыцца пад уплывам падзення паставак з Венесуэлы. Акрамя таго, існуюць рызыкі зніжэння экспарту іранскай нафты», — пішуць аналітыкі Bank of America. Краіны АПЕК+ з высокай імавернасцю будуць і налета падтрымліваць цэны на нафту. Пры гэтым сярэдняя цана нафты Brent у 2018 годзе складзе $70 за барэль, а ў 2019-м узнімецца да $75, адзначаецца ў аглядзе. Пры гэтым аналітыкі ўпэўненыя, што рост цэн на нафту будзе кароткатэрміновым.

## ЭКС-КІРАЎНІК КАТАЛОНІІ КАРЛЕС ПУЧДЭМОН БОЛЬШ НЕ ПРЭТЭНДУЕ НА ПЕРАВЫБРАННЕ

Ён вылучыў замест сябе новую кандыдатуру на пасаду кіраўніка рэгіянальнага ўрада. Падтрымку Пучдэмон выказаў дэпутату парламента аўтаноміі Кіму Торэ. Цяпер яго павінен зацвердзіць спікер заканадаўчага сходу. Перавыбранне кіраўніка Жэнералітэта не ўдаецца правесці ўжо некалькі месяцаў па цэлым шэрагу прычын, а напярэдадні Канстытуцыйны суд Іспаніі фактычна заблакаваў удзел у іх Пучдэмона. Экс-кіраўніка аўтаноміі шукаюць па шэрагу абвінавачванняў. Цяпер ён знаходзіцца ў Германіі, дзе яго выпусцілі пад заклад і падпіску аб нявыездзе. Калі праблему не вырашаць да 22 мая, то давядзецца ладзіць датэрміновыя выбары.

## СЕЙМ ПОЛЬШЧЫ ПРЫНЯЎ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ЗНІЖЭННІ ЗАРПЛАТЫ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ

Цяпер зарплата дэпутата і сенатара будзе адпавядаць 80 % памеру заработнай платы намесніка дзяржсакратара. За прыняцце законапраекта прагаласавалі 240 дэпутатаў, два было супраць, пяць устрымаліся. Не прынялі ўдзел у галасаванні 213 дэпутатаў, у тым ліку апазіцыйная фракцыя «Грамадзянская платформа», «Навачэсная», і Польская сялянская партыя. На ранейшым узроўні застануцца сумы, прызначаныя на пакрыццё расходаў дэпутатаў, звязаных з выкананнем абавязкаў на тэрыторыі краіны. Гэтыя выдаткі будуць складаць 25 % акладу намесніка дзяржсакратара. Падчас разгляду законапраекта дакумент падвергнуўся жорсткай крытыцы апазіцыйных дэпутатаў. Законапраект аб зніжэнні заробкаў дэпутатам падрыхтавала кіраўнічая партыя Польшчы «Права і справядлівасць» пасля таго, як у Польшчы разгарэўся скандал вакол прэмій, якія былі выплачаныя членам урада. Кіраўнічая партыя таксама вырашыла, што міністры вернуць гэтыя прэміі, перадаўшы іх на дабрачынныя мэты.

■ Па сутнасці

# Нават у самай таннай забягалаўцы павінен гучаць джаз

## Як зменшыць колькасць разводаў і абортаў? Адказы на гэтае пытанне шукалі ўдзельнікі дыскусіі, прымеркаванай да Міжнароднага дня сям'і

**Сучасная моладзь не падрыхтаваная да шлюбу, не хоча несці адказнасць за ўстойлівасць сямейных адносін. Аб гэтым сведчыць высокі ўзровень разводаў у нашай краіне.**

— 32 тысячы разводаў у мінулым годзе (гэта пры тым, што летась было заключана 66,2 тысячы шлюбаў), столькі ж у пазамінулым, — адзначыла **Святлана БЕЛАШ, кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.** — Практычна 40 % шлюбаў, якія распадаюцца, — маладыя, у якіх сужэнцы пражылі менш за пяць гадоў. Штогод практычна 25 тысяч дзяцей перажываюць развод бацькоў, пасля чаго выхоўваюцца ў няпоўнай сям'і. Таму сёння вельмі актуальнай з'яўляецца задача па ўмацаванні шлюбна-сямейных адносін. Неабходна ўдасканальваць не толькі заканадаўства па сямейнай палітыцы, але і сістэму падрыхтоўкі моладзі да шлюбу. Павышаць даступнасць кансультацыйных паслуг для пар, якія знаходзяцца ў крызіснай сітуацыі, развіваць сямейную медыяцыю, распрацоўваць праграмы, накіраваныя на павышэнне прававой культуры сужэнцаў.

Большасць сучасных жанчын і мужчын, на думку ўдзельнікаў дыскусіі, не гатовыя да сямейнага жыцця, бацькоўства.

— Як жыць у шлюбе, як выходзіць з крызісных сітуацый — гэтаму трэба вучыць, гэтак жа, як і мацярынству, — перакананa **Вераніка СЯРДЗЮК, старшыня Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля».** — Так, Міністэрствам адукацыі распрацавана некалькі сямейных праектаў. Але людзей, якія адказваюць за іх ажыццяўленне і пры гэтым насамрэч гараць сваёй справай, не хапае. Я ведаю некалькі такіх энтузіястаў — у Барысаве, Міры, Вілейцы — іх вельмі мала. У кожнай школе павінен быць такі чалавек. І яны павінны атрымліваць дадатковы матэрыяльны стымул.

**Алена СІМАКОВА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі,** адзначыла, што ў школах з кожным годам павялічваецца колькасць факультатываў, накіраваных на падрыхтоўку да стварэння сям'і. Праўда, наведванне іх на сёння добраахвотнае. «Часта бацькі, выбіраючы, які факультатыў будзе наведваць дзіця, аддаюць перавагу вучэбным прадметам».

Вераніка Сярдзюк таксама звярнула ўвагу прадстаўнікоў міністэрстваў на тое, што ў нашай краіне дагэтуль няма праграмы падтрымкі студэнцкай сям'і. «Калі мы хочам, каб дзеткі з'яўляліся на свет здаровымі, жанчыны павінны пачынаць нараджаць з 20 гадоў. У нас жа сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб — ажно 28 гадоў. Зараз на ўсю краіну ўсяго толькі 400 студэнцкіх сем'яў, мы павінны ведаць сваіх герояў у твар».

Акрамя таго, старшыня «Матулі» падзялілася вынікамі ўнутранага даследавання аб прычынах перапынення цяжарнасці.

— Калі казаць пра агульны партрэт жанчыны, якая перапыняе цяжарнасць, гэта не 16-гадовая дзяўчына, якая аступілася, як думаюць многія. А замужняя спадарыня (ці ў адносінах), якая мае аднаго ці больш дзяцей. Ёсць дзве асноўныя прычыны, чаму жанчына ідзе на аборт. Па-першае, жорсткія рэпрадуктыўныя ўстаноўкі, якія мы павінны пераадольваць. У нас дагэтуль нормай лічыцца мець аднаго ці двух дзяцей. Імідж шматдзетнасці ў нашай краіне, на жаль, дагэтуль не на вельмі высокім узроўні. Звярніце ўвагу, як рэкламуюць сваю прадукцыю беларускія вытворцы: адзінкавыя з іх змяшчаюць фотаздымкі са шчаслівымі шматдзетнымі сем'ямі. У асноўным адзін-два дзіцяці і сабачка. Гэта важна. Па-другое, не фінансавы стан штурхае жанчын на аборты, а дрэнныя адносіны з татам дзіцяці, якое яна носіць пад сэрцам. Вельмі часта гэта сужыцельства. Тады жанчына не мае ніякіх гарантый, што мужчына будзе дапамагаць ёй у дэкрэтным водпуску. А гэта час, калі яна, як ніколі, мае патрэбу ў падтрымцы.

— Хачу прывесці прыклад Японіі. Там я нідзе не знайшоў сродкаў кантрацэпцыі на касах прадуктовых крамаў, як у нас, — дадаў **протаіерэй Павел СЯРДЗЮК, настаяцель прыхода храма Свяціцеля Мікалая Японскага ў Мінску.** — Нідзе не бачыў сексуалізацыі ў візуальнай рэкламе ў месяцах, дзе бавяць час маладыя людзі. Нідзе не пачуў агрэсійнай, бессэнсоўнай музыкі, нават у самай таннай забягалаўцы гучыць джаз і прыемныя класічныя кампазіцыі. Калі мы зацікаўлены ў фарміраванні вобраза сям'і, у якой нараджаецца трое і больш дзяцей, трэба перагледзець шэраг практык, якія транслююцца ў масавую свядомасць грамадства.

У канцы дыскусіі ўсе яе ўдзельнікі сышліся на думцы, што было б цудоўна, каб з'явілася вельмі якасная адукацыйная праграма, якая была б рэалізавана па ўсёй краіне. У яе маглі б увайсці многія аспекты сямейнай палітыкі: пачынаючы ад падрыхтоўкі да шлюбу, заканчваючы дапамогай сужэнцам у крызісных сітуацыях.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК** ■

# ІНФЛЯЦЫЯ Ў КРАСАВІКУ СКЛАЛА ТОЛЬКІ 0,3 %

## Індэксацыі заробкаў за апошні месяц не плануецца

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў красавіку 2018 года за месяц склаў 100,3 %. У цэлым за год (у параўнанні з красавіком 2017 года) пакачык інфляцыі павялічыўся на 5 %, а ў параўнанні са снежнем 2017 — на 2,8 %. Паводле інфармацыі Белстата, за месяц харчовыя тавары падаражэлі на 0,4 %. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі за месяц на 0,01 %. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў красавіку за месяц вырас на 0,5 %.**

### ШТО ПАЧЫМ

Сярод прадуктаў харчавання за месяц цэны больш за ўсё знізіліся на свежыя агуркі (на 14,5 %), салодкі перац (10,3 %), бананы (8,3 %), грэчку (3,7 %), вінаград (2,1 %).

Больш за ўсё падаражэлі свежыя памідоры (на 16,3 %), буракі (15 %), морква (14,6 %), белакачанная капуста (12,8 %), яблыкі (7,5 %) і бульба (5,2 % ).

Сярод нехарчовых тавараў знізіліся цэны на некаторыя пазіцыі адзення і абутку. На 0,3 % знізіліся цэны на галантарэю. Кошт тавараў бытавой хіміі знізіўся на 0,9 %. Крыху падаражэла мэбля — на 0,5 %.

Паслугі міжнароднага чыгуначнага транспарту ў красавіку падаражэлі на 23,9 %, міжгароднія і міжнародныя званкі — на 3,6 %, інтэрнэт — на 3,4 %. Пры гэтым рытуальныя паслугі сталі таннейшымі на 7,1 %, паслугі банкаў — на 1,3 % і бытавыя паслугі — на 1,1 %.

### ДАХОДЫ БЕЗ КАРЭКЦІРОЎКІ

Мінімальная заработная плата і даходы жыхароў краіны за красавік не будуць індэксавацца. Паводле інфармацыі Мінпрацы, у адпаведнасці з законам «Аб індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі», карэкціроўка заробкаў і даходаў (кампенсацыя страт ад інфляцыі) не адбудзецца таму, што ўзровень інфляцыі не перавысіў пяціпрацэнтнага парога да студзеня 2018 года — месяца, у якім пераглядалі дапамогу па беспрацоўі і стыпендыі грамадзянам у перыяд прафпадрыхтоўкі па кірунку Мінпрацы, усталяваныя ад базавай велічыні.

Не перавысіў індэкс спажывецкіх цэн пяціпрацэнтнага парога і ў адносінах да сакавіка, калі пераглядаліся грашовыя даходы грамадзян, якія тыя атрымлівалі з бюджэтных крыніц, і да месяцаў перагляду заработнай платы дзяржслужачых, грашовага забеспячэння вайскоўцаў.

Мінімальная заработная плата, устаноўленая ўрадам з 1 студзеня 2018 года ў памеры 305 рублёў, за сакавік таксама не індэксуецца.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# Сяброўскае вітанне Таджыкістану

**Напярэдадні Дзён Беларусі ў Таджыкістане пабачыў свет спецыяльны выпуск газеты «Літаратура і мастацтва», прысвечаны Таджыкістану, таджыкскай літаратуры.**

У Выдавецкага дома «Звязда» — вялікі вопыт супрацоўніцтва з Таджыкістанам, таджыкскай творчай інтэлігенцыяй. Неадночы і на старонках «Звязды» асвятлялася таджыкская тэма, расказвалася пра пераклады з таджыкскай паэзіі, прозы. Прыязна заўжды ставіліся да публікацыі таджыкскіх аўтараў часопісы «Полымя», «Маладосць».

А зараз на некалькіх старонках газеты творчай інтэлігенцыі знайшлося месца і гутаркам з беларускім амбасадарам у Душанбэ Алегам Івановым і паслом Таджыкістана ў Беларусі спадаром Махмадшарыфам Хакдодам, і іншым досыць цікавым публікацыям, якія распавядаюць пра гісторыю і сучасны стан беларуска-таджыкскіх адносін у галіне літаратуры і культуры. Жанна Капуста ў артыкуле «Госць — чалавек невыпадковы: з гісторыі літаратурных сувязяў» расказвае пра станаўленне літаратурных кантактаў паміж Беларуссю і Таджыкістанам у 1960-я гады, згадвае шмат цікавых прыкладаў супрацоўніцтва. З інтэрв'ю ў «ЛіМе» выступае і старшыня Саюза пісьменнікаў Таджыкістана вядомы паэт, перакладчык Нізом Касім.

Адметнай публікацыяй уяўляецца старонка перакладаў таджыкскай паэзіі. З вершамі ў «ЛіМе» выступаюць Нізом Касім, Гулрухсор Сафі, Аскар Хакім, Ато Мірхаджа. Перакладчыкі іх твораў на беларускую мову — Павел Астравух, Іна Фралова, Мікола Шабовіч, Людміла Хейдарава, Марыя Кобец, Генадзь Аўласенка, Яна Будовіч.

Можна смела канстатаваць, што і гэты спецыяльны выпуск «ЛіМа», прысвечаны таджыкскай літаратуры, стане асобнай старонкай у добрых сяброўскіх сувязях паміж пісьменнікамі Беларусі і Таджыкістана.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ «Еўрабачанне-2018»

# Стаўкі зноў памяняліся

**Сёння ў Лісабоне адбудзецца гранд-фінал 63-га міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачанне». У ім выступяць прадстаўнікі 26 краін — па 10 найлепшых з кожнага паўфіналу, артысты «вялікай пяцёркі» заснавальнікаў — Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Францыі, і краіны-гаспадыні сёлетняга шоу Партугаліі. Прамую трансляцыю канцэрта ў нашай краіне будуць весці тэлеканалы «Беларусь 1» і «Беларусь 24».**



Фота eurovision.tv.

Па выніках другога паўфіналу ў топ-10 увайшлі канкурсанты з Сербіі, Малдовы, Венгрыі, Украіны, Швецыі, Аўстраліі, Нарвегіі, Даніі, Славеніі і Нідэрландаў. Нагадаем, у першым паўфінале рашэннем журы і тэлегледачоў пуцёўкі ў фінал атрымалі артысты з Аўстрыі, Эстоніі, Кіпра, Літвы, Ізраіля, Чэхіі, Балгарыі, Албаніі, Фінляндыі і Ірландыі.

Спявачка з Расіі Юлія Самойлава, на жаль, кваліфікацыйны бар'ер не пераадолела, як двума днямі раней не здолеў пераадолець яго і прадстаўнік Беларусі ALEKSEEV. Таксама ўпершыню за апошнія пяць гадоў фінальны канцэрт пройдзе наогул без краін Закаўказзя — Арменіі, Грузіі і Азербайджана.

Якія выніковыя месцы заняў ALEKSEEV і іншыя няўдачлівыя артысты і хто канкрэтна падтрымаў, а хто праігнараваў канкурсантаў, мы даведаемся толькі пасля фіналу 12 мая — такія правілы конкурсу. Пакуль жа застаецца толькі канстатаваць, што пятнаццатая па ліку спроба Беларусі скарыць еўравізійную сцэну плёну не прынесла.

Між тым інтрыга вакол сёлетняга шоу ўсё яшчэ закручваецца — напярэдадні фіналу ў вядучых букмекерскіх канторах змяніліся фаварыты. Самай імавернай пераможцай у конкурсе цяпер лічыцца прадстаўніца Кіпра Элені Фурэйра, стаўкі на якую ў пятніцу прымаліся ўжо з нізкім каэфіцыентам 2—2,5. Другое месца аддаюць ізраільскай жанчынесвяту Нецэ Барзілай, а трэцюю прыступку прадракаюць дуэту «Madame Monsieur» з Францыі. Зрэшты, не варта скідваць з рахунку і «беларускага нарвежца» Аляксандра Рыбака: калі яму ўдасца зламаць скепсіс букмекераў і другі раз зачараваць еўрапейскіх гледачоў і журы, то перамога стане найлепшым падарункам да дня нараджэння, які спявак адзначыць 13 мая. Дапаможам яму ў гэтым?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НАЙЛЕПШЫЯ ВА ЎСІМ

**У Брэсце ўзнагародзілі лаўрэатаў звання «Чалавек года Брэстчыны», а таксама пераможцаў спаборніцтва за найлепшыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Фотаздымкі лаўрэатаў, назвы прадпрыемстваў-пераможцаў занесены на Дошку гонару вобласці.**

Дыпломы пераможцы атрымалі ад старшыні аблвыканкама Анатоля ЛІСА.

У ліку лаўрэатаў за дасягненні 2017 года — Павел Пінігін, дырэктар 558-га авіяцыйнага рамонтнага завода і Юрый Плаксін, галоўны інжынер прыватнага вытворчага прадпрыемства «Вікторыя». Сярод працаўнікоў аграпрамысловага комплексу ўзнагародай адзначаны галоўны аграном ААТ «Агра-Моталь» Валерый Стасевіч. Медыкам года прызнаны загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі для дзяцей Брэсцкага абласнога радзільнага дома Сяргей Філатаў, педагогам года — дырэктар установы адукацыі «Дапаможная школа г. Брэста» Людміла Дзенісевіч. У галіне культуры адзнаку атрымаў мастацкі кіраўнік гарадскога духавога аркестра Валерый Коваль. Званне «Чалавек года» прысуджана па 16 намінацыях.

Пераможцамі спаборніцтва за дасягненне найлепшых паказчыкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці прызнаны горад Баранавічы, Камянецкі раён, Пінкавіцкі сельскі Савет Пінскага раёна.

## ПАСЛЯ НЯШЧАСНАГА ВЫПАДКУ

### ў Брэсце дадаткова абследуюць дрэвы

Вечар святочнага дня ў Брэсце быў азмрочаны бурай, якая наляцела на горад каля 17 гадзін і бушавала амаль паўгадзіны. Асабліва моцныя парывы ветру адзначаліся ў цэнтры горада, у раёне парку культуры і адпачынку і Брэсцкай крэпасці. Каля школы № 9 па вуліцы Наганава, якая знаходзіцца побач з паркам, вецер зваліў старое дрэва. Яно ўпала на школьную агароджу, фрагмент якой моцна папсавала. На шчасце, нікога не было побач, тут абышлося толькі матэрыяльнымі стратамі. Яшчэ адно дрэва ўпала на скрыжаванні праспекта Машэрава і вуліцы Кірава. А ўсяго ў гэты дзень на пульт дзяжурнага МНС паступіла пяць паведамленняў пра падзенне дрэў. Іх ужо прыбралі камунальнікі.

А вось у цэнтральным парку культуры і адпачынку здарылася бяда. Галіна вялікага дрэва ўпала на гандлёву палатку. У гэтую палатку зайшла перачакаць ураган сям'я, якая адпачывала непадалёк. У выніку пацярпела дзяўчынка 2007 года нараджэння, паведамілі ў абласным упраўленні ўнутраных спраў. Школьніца ў цяжкім стане дастаўлена ў рэанімацыю абласной бальніцы.

На наступны дзень адбылося пасяджэнне гарадской камісіі па надзвычайных сітуацыях. Было адзначана, што ўсе дрэвы, якія паламала ветрам, былі здаровыя і знешне ніякай пагрозы не ўяўлялі. Але камісія прыняла рашэнне правесці паўторную праверку ўсіх дрэў у месцах правядзення масавых мерапрыемстваў, на тэрыторыі ўстаноў адукацыі, культуры і аховы здароўя, на вуліцах і ў дварах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЗНЯЛІ З ЛЕБЕДЗЯ ПУТЫ

**На возеры Доўгім у Капыльскім раёне інспектары выратавалі лебедзя, які заблытаўся ў сетцы. Птушку, што патрапіла ў бяду, заўважыла сям'я адпачывальнікаў. Сетка абблытала крыло і лапы лебедзя.**

— Нераўнадушныя грамадзяне паведамілі пра здарэнне ратавальнікам, тыя — нам. Вызваліцца з пасткі птушцы дапамаглі работнікі Нясвіжскай міжраённай інспекцыі, хоць зрабіць гэта было не так проста, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Птушку паспрабавалі прыкарміць, але на блізкую адлегласць лебедзь усё роўна не падпускаў, тады было вырашана выйсці на ваду на лодцы і накіраваць яго ў чарот. Прыбярэжныя зараснікі пазбавілі птушку манеўранасці і, скарыстаўшыся гэтым, дзяржінспектары змаглі зняць путы. Пасля гэтага яны абследавалі вадаём, на шчасце, іншых сетак на возеры не выявілі.

## НА ВАГОНЕ ПАДНЯЎ РУКУ ЎГОРУ...

**На чыгуначнай станцыі Сцяпянка ў сталіцы быў траўмаваны чалавек. Мінчанін атрымаў апёкі ад полымя электрычнай дугі.**

Па інфармацыі Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце, малады чалавек 1996 года нараджэння адпачываў з сябрамі на лецішчы, размешчаным паблізу станцыі. Баўленне часу не абышлося без ужывання алкаголю. Бліжэй да вечара пацярпелы выйшаў на вуліцу і заўважыў грузавы цягнік, які стаяў. Ён беспрычынна залез на адзін з вагонаў і падняў угору руку. Ад полымя электрычнай дугі хлопец атрымаў апёкі і быў скінуты з вагона на зямлю. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі даставіла маладога чалавека ў бальніцу з камбінаванай траўмай (электратраўма чацвёртай ступені цяжкасці, паражэнне высакавольтнай электрычнасцю, электратэрмічныя апёкі галавы, шыі, тулава, рук і ног). Пацярпелы знаходзіцца ў апёкавым аддзяленні бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

## ПА ПАШПАРЦЕ СЯСТРЫ

### жанчына спрабавала ўзяць крэдыт

**35-гадовую непрацуючую жыхарку Мінскага раёна затрымалі супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС сталіцы: тая спрабавала ўзяць крэдыт на суму пяць тысяч рублёў у адным з гарадскіх банкаў.**

Зламысніца, звяртаючыся туды, прад'явіла дакументы, пры праверцы якіх у супрацоўніка ўстановы ўзніклі сумненні ў іх сапраўднасці. У банку жанчыне адмовілі ў выдачы крэдыту і звярнуліся ў міліцыю. Падазраваную затрымалі. Падчас праверкі было ўстаноўлена, што грамадзянка спрабавала аформіць крэдыт па пашпарце сваёй сястры. Дакумент яна ўзяла, калі тая адсутнічала ў кватэры. Па артыкулах за махлярства, а таксама за падробку, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў супраць жанчыны заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Анёл у белым халаце

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Загадчыца фельчарска-акушэрскага аддзялення вучылішча заўважыла мяне, прапанавала: «Іна, паступай да нас. Нам такія рукі патрэбны». А я крыві баюся! Але вырашыла здаваць экзамены, — успамінае жанчына.

Па размеркаванні яна трапіла ў радзільны дом, у палату для нованароджаных. Потым замужжа, адзін дэкрэт, другі. Магчыма, Іна і працягвала б працаваць у радзільні, але памерла яе мама. Прыйшлося вырашаць з мужам, каму сысці з работы: ні ў аднаго з іх графік не дазваляў глядзець сыноў, адводзіць іх у сад. Муж больш атрымліваў, таму звольнілася Іна. Калі дзеці крыху падраслі, жанчына зноў стала шукаць працу.

— Абышла навакольныя паліклінікі і бальніцы — нідзе не бралі з маленькімі дзецьмі. Я стала на біржу — мне прапанавалі вакансію на заводзе Вавілава, які прастойваў. Натуральна, мяне не ўзялі, я там непатрэбна была. Пасядзела тыдзень дома, прыйшла ў службу занятасці зноў. Сказала: дайце хоць якую работу. Уручылі мне раздрукоўку з вакансіямі, а там — Чырвоны Крыж. Сяброўка, медработнік, параіла: «Ідзі, не думай, нармальна будзе». Як уладкавалася сястрой, так і засталася.

Іна працуе на паўтары стаўкі. Па норме павінна быць 11 падапечных, але цяпер іх дзевяць — двое памерлі некалькі месяцаў таму. Да ляжачых жанчына ходзіць штодзень (а калі трэба ранкам і ўвечары калоць лекі, то і двойчы на дзень), да астатніх — па некалькі разоў на тыдзень.

— У мяне падапечны быў — паралізаваны мужчына, 64 гады. Ён саромеўся, калі я яго мыла. Кажу: «Вы ўспрымайце мяне не як жанчыну, а як медработніка», — расказвае сястра міласэрнасці.

На кожны візіт адведзена гадзіна: 20 хвілін — на дарогу, 40 — на догляд. Але, прызнаецца Іна, за гэты час паспець амаль нерэальна. Адрасы раскіданы па ўсім горадзе, ды і абавязкаў шмат. Справаздачы жанчына піша ўночы — тады ж, калі збірае мужу «ссабойкі» на работу. На выхадных не да гэтага — трэба на лецішча з'ездзіць, сына ў арміі праведаць.

## ШКАРПЭТКІ, ЯКІЯ САГРЭЛІ ВЕТЭРАНА

Раніцай, яшчэ да нашай сустрэчы, Іна паспела з'ездзіць у паліклініку па даведку ў санаторый. Яе чакаюць у кватэры на праспекце Пераможцаў. Дзверы нам адчыняе ветэран вайны Валянціна Паўлаўна Чудаева. «Звязда» ўжо расказвала гісторыю гэтай легендарнай жанчыны (нумар за 3 ліпеня 2014 года). Зенітчыца, адзіная жанчына — камандзір гарматы ў Беларусі. Яе лёс апісала Святлана Алексіевіч у раздзеле «Тэлефонная трубка не страляе...» сваёй славутай кнігі. Пра тое, як 17-гадовая дзяўчына Валя трапіла на фронт, як ледзь не засталася без ног пасля абмаражэння, як крыўдна было, калі пасля вайны ўшаноўвалі толькі мужчын, а на жанчын быццам забыліся... Цяпер Валянціне Паўлаўне 93 гады, але яна не страціла востры розум і пачуццё гумару.

— Давай свае паперы, буду распісвацца. З мужам адзін раз, а з табой — сто, — жартуе ветэран з маладым кур'ерам, які прывёз ёй прадукты. І дае яму наказ на дарогу. — Міру вам, каб вы не ведалі, што такое вайна. На нашу долю дасталася спаўна, а вам дорым духоўную спадчыну. *(І з усмешкай.)* А любіць толькі раз — дзяўчат не падманвай.

Пакуль сястра міласэрнасці выгружае прадукты, Валянціна Паўлаўна дзеліцца апошнімі навінамі.

— Сёння крама прыслала мне сукенкі, штук 20 на выбар, напэўна. Я адну купіла. Але ўсё — хімія-хімія. Кажу: «Дзяўчаты, што ж вы сацін не прывезлі?». А яны бавоўну атрымліваюць у панядзелак, будуць мне званіць.

З Інай ветэран пазнаёмілася 12 гадоў таму. «Я заходзіла да Ізольды (Ізольды Семушынай — галоўнай медсястры службы сясцёр міласэрнасці чыгункі. — **Аўт.**) пагутарыць. Скардзілася: «Ногі мерзнуць, мне б шкарпэткі вязаныя, з натуральнай воўны», — успамінае Валянціна Паўлаўна. — І стаяла гэтая дзяўчынка, пачула. А ў яе маці — рукадзельніца найвышэйшай маркі. Наступны раз завітваю да Ізольды — і Іна з'яўляецца. Са шкарпэткамі. І такімі беласнежнымі — яны нават ніткай звязаныя былі, не адзетыя ні разу. Дагэтуль у мяне цэлыя захоўваюцца, толькі не налазяць ужо. Дробязь, а як прыемна. Пасля гэтага Іна стала маёй».

Пенсіянерка прызнаецца: сястра міласэрнасці прыносіць у дом супакой і надзею.

— Свой працоўны час яна не лічыць. Гэта не проста медсястра: прыйшла на пару хвілін — і чава-какава. Я, бывае, тэлефаную Іне дадому, а яе яшчэ няма, а часу ўжо — дзявятая гадзіна. Сын трубку здымае: «Мама на рабоце»... *(да Іны)* Беражы сябе. Я цябе чакаю, як анёла ў белым халаце.

Сястра пазней раскажа, як выязджала да сваіх падапечных нават уночы. «На Чкалава муж з жонкай жылі. Ёй 84, яму 89. А ў мужчыны — апошняя стадыя анкалогіі. Блізкія сваякі — у Гродне і Віцебску. Пенсіянерка пытае: «Калі ён памрэ, што рабіць?». Я і кажу: «Званіце мне». А напярэдадні выхадныя. Думаю: «Божа, толькі б не ў гэтыя дні». Толькі ўлеглася спаць, у гадзіну ночы званок на мабільны тэлефон. «Іна, ён памёр. Ты прыедзеш?» — чую ў трубцы. А я ж паабяцала. Муж: «Ну што рабіць, збіраемся».

## СПІС ПАКУПАК ДЛЯ ІНШЫХ

— Я неяк днямі заплаціла за праезд за бамжа. Ну так атрымалася, — з усмешкай апраўдваецца Іна, пакуль чакаем на прыпынку патрэбны аўтобус. — Ён з бальніцы хуткай дапамогі ехаў. Зайшлі кантралёры, кажуць: «Выходзь». А ён бурчыць, што дадому трэба. Я купіла яму білет. Гэта ж таксама чалавек. Ды і выглядаў ён не зусім дрэнна: так, зарослы, але кашуля, красоўкі чыстыя.

...Дом на вуліцы Розы Люксембург. І яшчэ адна Валянціна — Васілеўна. Пенсіянерка жыве адна 22 гады з таго часу, як памёр муж. З родных у Валянціны Сарамоцінай — пляменнікі, якім самім па 60. Раз на тыдзень заязджаюць да яе, прывозяць прадукты.

Сястра міласэрнасці дапамагае пенсіянерцы памыцца самой, мые адзенне, і бялізну.

— Нам у пральню трэба рэчы завозіць, але адсюль яна далёка — лягчэй самой памыць, — тлумачыць Іна.

Яна заўсёды пра нас памятае. Убачыла парашок на зніжцы — купіла, — дадае Валянціна Васілеўна.

— Я запісваю, каму што трэба. Калі ведаю, што ў нейкай краме акцыя, заходжу туды. Сын едзе з працы, пасля 12-гадзіннай змены, і пытае: «Мама, куды трэба заехаць?».

Ініны хлопцы часта дапамагаюць. Калі былі дзецьмі, хадзілі ў чыгуначны садок, а ён закрываўся на лета. Таму сыноў жанчына брала з сабой на работу: яны і памперсы выносілі, і парадак наводзілі.



Іна ДАЎГУЛЕВІЧ дапамагае падапечнай на кухні.

## «НЯЎЖО МОЖНА ІНАКШ?»

— Я да чалавека стаўлюся як па біблейскім запаведзе: так, як хачу, каб ён да мяне ставіўся. Адчуваю яго боль, — Іна дзеліцца асабістым. — У мяне мама ляжала, свякроў. Свякроў захварэла, калі мае дзеці былі школьнікамі. Мы забралі яе да сябе ў аднапакаёвую кватэру, хоць у яе яшчэ два сыны. Мне ўсе казалі: «Дурніца». А няўжо можна было інакш?

За 15 гадоў, што жанчына працуе сястрой міласэрнасці, пад яе доглядам было 117 падапечных. Пра многіх расказвае з цеплынёй.

— Быў мужчына сляпы. У яго заўсёды шторка была адвешана. Сыходзіш — ён стаіць каля акна і махае табе, хоць не бачыць.

Іна не хавае: не з усімі лёгка паладзіць. Складаны характар у былых кіраўнікоў. А калі яна толькі пачынала працаваць, да некаторых падапечных баялася заходзіць. Адна бабуля, напрыклад, заўсёды адчыняла дзверы з нажом у руцэ. У іншай жанчыны дома была страшэнная антысанітарыя: усё завалена хламам, бегалі прусакі. Іна не асмельвалася торбу на падлогу ставіць, каб не прыцягнуць тых прусакоў сабе ў кватэру.

Раней служба міласэрнасці брала пад апеку не толькі адзінокіх, але і тых, каго дзеці проста не глядзелі. Сястра ўспамінае сляпога пенсіянера, які пражываў разам з сынам-алкаголікам у аднапакаёўцы, раздзеленай шафай на дзве паловы. П'яніцу не было ніякай справы да бацькі: толькі кампаніі ў дом вадзіў.

— Паміж намі кажучы, практычна ва ўсіх падапечных ёсць сваякі. Пляменнікі, унукі, дзеці за мяжой. Яны ўсе чакаюць... — Іна робіць шматзначную паўзу. — Жанчына вось нядаўна памерла. У яе ўнук жыў у тым жа раёне, што яна. Хлопцу 20 гадоў. Неяк са сваім малодшым сынам прыношу пенсіянерцы тры торбы прадуктаў. І ўспомніла, што капусту не купіла. Унук той якраз у бабулі сядзеў. Кажу: «Няхай збегае». А ён толькі хмыкнуў і на майго сына кіўнуў: «Лепш ён». Уяўляеце? У бабулі 200 рублёў на дзень нараджэння папрасіў, каб у кальянную схадзіць. Тая адмовіла. Пакрыўдзіўся на яе і прыйшоў толькі ў рытуальную залу. Ужо там расплакаўся. Хлопцу, праўда, сваякі тады сказалі: «Цябе твая бабуля не пакрыўдзіла, а ты яе — вельмі».

Іна перажывае за ўсіх. Толькі на сябе ў яе часу не заўсёды хапае. На сераду брала талончык да тэрапеўта, каб выпісаць лекі: у жанчыны праблемы з сэрцам. Але да ўрача не паспела, затрымалася на візіце.

— Былі, вядома, перыяды, калі здавалася: надакучыла, — не ідэалізуе суразмоўніца. — Але да людзей прывыкаеш. Думаю: добра, дагледжу ўсіх гэтых падапечных, а ўжо потым сыду.

***— Вы столькі бачылі — абыякавасці, адзіноты, няўдзячнасці. Не баіцеся старасці?***

— Са сваёй сям'ёй не баюся. Мы вельмі дружныя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Да ветэрана вайны Валянціны Паўлаўны ЧУДАЕВАЙ сястра міласэрнасці прыходзіць двойчы на тыдзень.

### Кампетэнтна

**Начальнік аддзела медыка-сацыяльнай работы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Наталля ПУГАЧОВА:**

— Больш за 60 працэнтаў пажылых і людзей з інваліднасцю аддаюць перавагу мадэлі жыцця, пры якой яны могуць атрымліваць медыка-сацыяльную дапамогу дома, а не быць размешчанымі ва ўстановы стацыянарнага тыпу. Таму прыярытэтным кірункам дзейнасці службы сясцёр міласэрнасці з'яўляецца аказанне гэтай дапамогі адзінокім і адзінока пражываючым старым.

У службе на пачатак года працавала 169 медыцынскіх сясцёр і 38 малодшых сясцёр міласэрнасці. Догляд дома летась атрымалі 1338 чалавек.

З 2013 года Беларускі Чырвоны Крыж сумесна з мясцовымі органамі паспяхова рэалізуе механізм дзяржаўнага сацыяльнага заказу. За пяць гадоў было падпісана 137 дагавораў па выкананні дзяржсацзаказу. Дзякуючы гэтаму штат службы сясцёр міласэрнасці павялічыўся на 37 працэнтаў.

Іншыя крыніцы фінансавання Беларускага Чырвонага Крыжа — гэта добраахвотныя членскія ўзносы і ахвяраванні грамадзян, спонсарская дапамога беларускіх арганізацый. Найбольшую ўдзельную вагу ў структуры затрат таварыства займаюць ахова здароўя і догляд, а таксама аказанне гуманітарнай дапамогі ўразлівым катэгорыям.

ПРАКАВЕТНАЕ

# Кацярынін «Карагод»





Дзякуючы **Кацярыне Аляксееўне ПАНЧЭНІ** і жыхарам вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна, на прыпяцкім Палессі захаваўся і працягваецца веснавы абрад «Юр'е» — адзін з самых старажытных у земляробчым календары ўсходнеславянскіх тэрыторый. Менавіта па традыцыі святкаваць «Юр'е» ведаюць у нашай краіне і саму вёску, і яе захавальнікаў — гурт «Міжрэчча» з ягоным нязменным кіраўніком. Восем гадоў таму ў вёсцы паставілі знак у гонар абраду, які ўнесены ў спіс нематэрыяльных культурна-гістарычных каштоўнасцяў.









Кожны год шостага мая мае калегі — фотакарэспандэнты і тэлеапературы з'язджаюцца ў вёску да хаты Кацярыны Аляксееўны, каб здымаць і паказваць надзвычай прыгожае і вясёлае дзейства — «карагод». Падчас свята ў хаце 77-гадовай паляшучкі не было вольнага месца — многія хацелі пабачыць і сфатаграфаваць пачатак абраду — упрыгожванне каравая рознакаляровымі папяровымі і жывымі кветкамі. Пірог-каравай напярэдадні выпекла сама гаспадыня, і называецца ён таксама — «карагод». Пад абрадавую песню: «Карагод, карагод, мы цябе наражаем! Цябе наражаем, Бога праслаўляем!..», жанчыны «прыбіраюць» галоўны атрыбут свята і выбіраюць «ваяводу», які і панясе каравай праз усю вёску. Не першы раз на пасаду ваяводы зноў абралі паважанага ў акрузе чалавека — **старшыню Азяранскага сельсавета Міхаіла АЛІФІРАЎЦА**.

І вось «карагод» нясуць у поле, дзе рунее жыта, каб «абрачыся» *(даць зарок)* перад галоўным апекуном земляробаў, урадлівасці і плоднасці глебы — Юр'ем. Па павер'ях, у гэты дзень святы Юр'я бярэ ў Бога ключы і адмыкае зямлю. «Святы Юрай — божы ключнік», — кажуць на Тураўшчыне і дадаюць: «Адмыкай зямлю, выпускай расу на цёплую зямлю, на буйное жыта!» Удзельнікі праходзяць пад ручніком, сыплюць зерне і бяруцца за рукі — водзяць карагод.

Заключная частка свята — абыход вёскі. Гаспадары выходзяць на вуліцу і чакаюць Кацярынін «карагод». Вясёлае войска на чале з ваяводам абавязкова паспявае пакарагодзіць і гаспадарам — бо гэта шчаслівы знак.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

***Больш здымкаў з гэтага свята глядзіце на сайце «Звязды» — zviazda.by.***

# Пад аховай нябеснай заступніцы

**Напярэдадні 100-гадовага юбілею магілёўскай міліцыі ўпраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама атрымала харугву з абліччам Бялыніцкай іконы Божай Маці.**

Гэта сімвалічная падзея адбылася падчас урачыстага мітынгу супрацоўнікаў міліцыі на месцы подзвігу капітана Канстанціна Уладзімірава і яго байцоў з батальёна міліцыі, якія ў пачатку вайны да апошняга ўздыху абаранялі гэты рубеж каля вёскі Гаі. Са словамі малітвы і духоўнага наказу **кіраўнік ваеннага аддзела Магілёўскай епархіі протаіерэй СЕРГІЙ** перадаў святыню **начальніку ўпраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама палкоўніку міліцыі Ігару ШЧАРБАЧЭНЮ**. Ігар Шчарбачэня адзначыў, што атрыманне гэтага дару — знакавая падзея для міліцыі, якая будзе садзейнічаць духоўнаму яднанню супрацоўнікаў у справе абароны вечных каштоўнасцяў грамадства — міру, дабра і справядлівасці.

На мітынгу былі адзначаны ўзнагародамі найлепшыя па службе. Нагрудны памятны знак «100 год магілёўскай міліцыі» атрымаў і **ветэран Вялікай Айчыннай вайны палкоўнік міліцыі ў адстаўцы Мікалай ІЛЬКЕВІЧ**. Міліцыянеры таксама ўшанавалі хвілінай маўчання памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны і ўсклалі кветкі да помніка байцам батальёна міліцыі капітана Уладзімірава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Платорг»** (УНП 690822247) **лічыць несапраўдным** у сувязі з тым, што яно згублена.

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

**К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ:**

1. Изолированное помещение водолечебницы, расположенное по адресу: Волковысский район, д. Теолин, ул. Молодежная, 5-2.

Аукцион состоится 31 мая 2018 года в 11.30.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 25 мая 2018 года до 13.00.

2. Здание котельной в Волковысском районе, д. Дулевцы, ул. Садовая, 16А.

Аукцион состоится 7 июня 2018 года в 12.00.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 1 июня 2018 года до 13.00.

**Подробная информация по телефонам:**
**В городе Волковыске 8 (01512) 4 50 25, 2 07 46**
**В городе Гродно 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02**
**Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by**

УНП 500042135

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении РУП «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт»**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1: МАЗ 9919 00-012,** р/з Т1032А (инв № по бух. учету 81491k). Начальная цена продажи: 8 518,14 бел. руб. без учета НДС. Сумма задатка 851,81 бел. руб. | |
| **Продавец** | РУП «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт» УНП 790254859, Могилевская обл, Могилевский р-н, Буйничский с/с, 2 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 29 мая 2018 года в 13.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 28 мая 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем заключается договор купли- продажи. Оплата производится в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи |
| **Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 28.03.2018** | |

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства 12 июня 2018 г. в 14.00

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 730/С-13540, наименование – клуб, площадь 1203,9 кв. м, расположенное на земельном участке 724050100001005187 площадью 0,2845 га. **Адрес**: г. Кричев, ул. Трудовая, 12.

**Начальная цена снижена на 20 % и составляет:** 108 086 бел. руб. 40 коп., **задаток** –10 808 бел.руб. 64 коп.

**Организатор аукциона:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения аукциона:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, УП «Могилевское отделение БелТПП».

**Лот № 1** продается без условий на аукционе в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе, внесли в установленном порядке задаток, который перечисляется на расчетный счет УП «Могилевское отделение БелТПП»: IBAN: BY55PJCB30123018571000000933, BIC: PJCBBY2X в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 300, УНП 700016628.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта недвижимого имущества осуществляется не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**Кроме того, победителем аукциона (покупателем) уплачиваются затраты на организацию и проведение аукциона.**

...Пустынная прасёлкавая дарога ў глухім лесе не выклікае аптымізму — ці туды мы завярнулі? Паступова шчыльныя шэрагі дрэў расступаюцца, і яркае святло сонца залівае аўтамабіль — машына выбралася з лесу і нетаропка рухаецца ўздоўж звычайных палёў. І вось нарэшце віднеецца месца прызначэння, канчатковы пункт маршруту — аднапавярховыя дагледжаныя домікі вёскі Заброддзе.

З набліжэннем да гэтага незвычайнага па многіх параметрах месца пачынае мільгаць у вачах: калі здалёку віднеюцца толькі карычневыя будынкі, якія патанаюць у зеляніне, то зблізку праз просты драўляны плот, які атачае вёску, прабіваюцца аранжавы, блакітны, сіні, чырвоны і многія іншыя колеры. Увесь гэты калейдаскоп аказваецца сапраўднай марай для кожнага аўтааматара — тут сабрана неверагодная колькасць рарытэтных аўтамабіляў. Класічныя савецкія і замежныя легкавушкі, кабрыялеты, грузавікі і матацыклы запаланілі палянкі, аднак найбольш займальныя экзэмпляры клапатліва схаваны пад зводамі гаражоў, а таксама пад адмысловымі прылеглымі навесамі.

Калекцыю гэтых легендарных машын нам пагадзіўся паказаць **скульптар Даніла ЦІТОВІЧ**, які можа расказаць усю паднаготную кожнага аўто. «У мяне стаіць шэраг аўтамабіляў войскаў вермахта, а таксама Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, — адзначыў ён. — Гэта тыя машыны, якія рэальна ваявалі. Ім па 80 гадоў — і ўсе яны на хаду».

Што да працэсу аднаўлення, то ў кожнай мадэлі ўсё індывідуальна, але ў цэлым каманда, якая працуе над «ажыўленнем», стараецца ўзнавіць тое, што было ў арыгінале. Здараецца і так, што запчасткі на некаторыя аўтамабілі не ўдаецца знайсці нават у дзяржаве-вытворцу — напрыклад, так было з Nash Ambassador, дэталяў да якога няма нават у ЗША. Аднак, на думку скульптара, у такіх выпадках лепш уставіць, напрыклад, іншы матор, але машына здабудзе новае жыццё.

Аднак мы трохі адхіліліся. Дык якія ж рарытэты часу вайны хаваюцца ў цёмных гаражах Заброддзя?

### ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ НА КОЛАХ

У глыбіні будынка віднеецца аўтамабіль, які для многіх людзей быў прадвеснікам страшнай бяды — легендарны «чорны варанок» ці ГАЗ М-1. Гэта самая масавая даваенная савецкая машына, якая выпускалася з 1936 да 1943 года. У вольны продаж яна не паступала, на ёй ездзілі прадстаўнікі сілавых ведамстваў, партыйнай наменклатуры, а падчас вайны — камандзіры, генералы і агенты НКУС. У рэдкіх выпадках яе атрымлівалі звычайныя людзі за асаблівыя заслугі. Усяго было выраблена каля 63 тысяч такіх аўтамабіляў.

За ім выглядае амерыканец Willys MB, які выпускаўся ў перыяд 1941—1945 гадоў. Удзел у конкурсе на распрацоўку прыняла 135 фірмаў, пры гэтым патрабаванні для таго часу былі вельмі сур'ёзныя: падрыхтаваная маса — 585 кг, максімальная хуткасць — не менш за 80 кіламетраў у гадзіну, вуглы ўезду і з'езду — 45 і 35 градусаў, здольнасць пераадолець брод да 30 сантыметраў.

У Чырвоную Армію па дамове ленд-лізу ён патрапіў улетку 1942 года. Цікава, што ў СССР іх адпраўлялі ў звычайных драўляных скрынках — такім чынам, «канструктар» збіралі разам ужо на месцы. Канструкцыя аўтамабіля вельмі простая, таму і ламацца ў ім няма чаму — трывалая рама, два вядучыя масты, надзейны чатырохцыліндравы рухавік магутнасцю 60 конскіх сіл. Дарэчы, аднаўлялі гэтую выдатную мадэль тры гады.

За ім стаіць, можна сказаць, першы савецкі джып — ГАЗ-67Б. На ім падчас вайны перавозілі параненых, пяхоту, ён выкарыстоўваўся не толькі як штабны і разведвальны аўтамабіль, але і як лёгкі артылерыйскі цягач. Выраблялася ён з 1943 да 1953 года: на свет з'явілася больш за 90 тысяч такіх аўто. Гэты джып атрымаў поўны прывод і матор аб'ёмам 3,3 літра магутнасцю 54 конскія сілы. Максімальная хуткасць — 90 кіламетраў у гадзіну. Сапраўдны працаўнік, аўтамабіль быў здольны пацягнуць за сабой амаль тону грузу.

Цікава, што ўся калекцыя ў мястэчку Заброддзе пачалася менавіта з гэтага прыгажуна: ён належаў інжынеру, якога ўгаворвалі прадаць машыну чатыры гады! Пры тым наўзамен мужчына атрымаў яшчэ і «Капейку».

### ПАВАЖАНЫ ЗАХАР ІВАНАВІЧ

Ёсць у засеках Заброддзя і аўтамабілі, якія не толькі перавозілі людзей, але яшчэ па-сапраўднаму ратавалі жыццё. Вядома, гаворка пра легендарны ЗІС-5, праўда, у беларускай вёсцы прадстаўлена крыху больш позняя яго мадыфікацыя 1942—1943 года з індэксам 5В. Гэтую машыну шафёры называлі Захар Іванавіч, а таксама трохтонка. У самыя кароткія тэрміны — усяго за 4 месяцы — быў сабраны гэты экзэмпляр, пры тым, што ў наяўнасці была толькі рама, колы, пярэдняя бэлька і частка капота! Ён вазіў людзей, а таксама прадукты харчавання.

Што толькі не рабілі на базе ЗІСа — стваралі аўтобусы, пажарныя машыны, бронемабілі, гэта даволі стандартныя мадыфікацыі. Але акрамя таго, мадэль трансфармавалася ў перасоўныя друкарні, снегаачышчальнікі, мясакамбінаты, цэлыя комплексы супрацьпаветранай абароны! Вось такі шматгранны быў аўтамабіль.

Як жа тут не ўспомніць пра ГАЗ-АА, так званую паўтаратонку (з-за грузападымальнасці ў 1,5 тоны). Згаданая мадэль — гэта мадэрнізаваны Форд-АА. На Горкаўскім аўтазаводзе яго збіралі задоўга да вайны — з 1932 года, а ў 1938 годзе ён атрымаў новы рухавік на 50 конскіх сіл і назву ГАЗ-ММ. Гэты аўтамабіль здзейсніў шматлікія подзвігі: менавіта ён першы стаў курсіраваць па магістралі на лёдзе Ладажскага возера, адвозіў у Ленінград прадукты харчавання, а назад вёз людзей, абсталяванне і розныя культурныя каштоўнасці. Нямала гераічных шафёраў разам з гэтым аўто апынуліся на дне возера, паколькі лёд не заўсёды вытрымліваў падарожнікаў... Але гэта толькі адзін маршрут — а колькі было іншых, колькі абедзве машыны выратавалі!

### АБ КОНЯХ У ЖАЛЕЗЕ

У кутку шырокага гаража хаваецца матацыкл М-72, які вырабляўся з вясны 1941 года да 1960-га. Узорам для поўнага капіравання стаў BMW R71 з апазітным рухавіком. Цікава, што канструкцыя немца была арыентаваная не столькі пад ваенныя патрэбы, колькі пад масавае спажыванне. Інжынеры Маскоўскага матацыклетнага завода пераймалі нямала тэхнічных навін, якія да таго моманту ў савецкай практыцы не ўжываліся.

Дарэчы, гэты матацыкл быў сканструяваны менавіта пад ваенныя мэты, таму да сярэдзіны 50-х гадоў у вольны продаж не паступаў. І паколькі як кожны такі матацыкл абсталёўваўся стралковай зброяй, ён класіфікаваў менавіта як бранятэхніка.

На долю гэтай тэхнікі выпала мноства складаных выпрабаванняў, якія з гонарам былі пераадолены. Страшная вайна скончылася, машыны сталі змяняць пакаленні — у завяршэнне наш гід паказаў яшчэ некалькі аўтамабіляў, якія маюць пэўнае значэнне для большасці савецкіх грамадзян.

### ЯК ЖА МЫ БЕЗ ПЕРАМОГІ?

...З-пад асобнага навеса, схаванага пад магутнымі дрэвамі, віднеецца легендарны ГАЗ-М-20 «Пабеда». Аўтамабіль мае цудоўную двухколерную афарбоўку — верх і частка капота ў яго сакавітага зяленага колеру, а астатнія часткі — цёмна-зялёныя. Гэта першы савецкі аўтамабіль з апорным кузавам і адзін з першых у свеце, які серыйна выпускаўся з кузавам цалкам пантоннага тыпу — без крылаў, якія выступаюць, і іх рудыментаў, падножак і фар.

Літаральна кожная дэталь «Пабеды» напоўнена гісторыяй — вось, напрыклад, эмблема на капоце. Калі ствараўся ГАЗ-М-20, у савецкіх аўтазаводаў не было пастаянных эмблем, таму пад кожны аўтамабіль рыхтавалі свой арыгінальны шыльдзік. На «Пабедзе» — гэта літара М, якая паказвала на назву «Молатавец» — тады завод у Горкім насіў імя Молатава. Яшчэ ў эмблеме можна разглядзець намёк на чайку, а таксама на зубец сцяны Ніжагародскага крамля. Заліўка шыльдзіка — чырвоная, у колер сцяга СССР.

Вядома, шмат хто чуў папулярную гісторыю пра назву гэтага аўтамабіля: першапачаткова яго хацелі назваць «Радзіма», але калі ў 1944 годзе Іосіфу Сталіну паказалі ўзор будучай серыйнай машыны, ён спытаў: «І пачым мы будзем Радзіму прадаваць?» Лічыцца, што пасля гэтага аўто вырашылі назваць «Пабеда», але, як аказалася, гэта ўсяго толькі міф. Розныя крыніцы пацвярджаюць, што ў гонар хуткай перамогі СССР над Германіяй назва «Пабеда» была замацавана яшчэ на пачатковых этапах распрацоўкі.

Дарэчы, у засеках Заброддзя ёсць вельмі цікавая мадыфікацыя «Пабеды» — ГАЗ-М-72, якая выпускалася з 1955 да 1958 года. Гэта сапраўдны пазадарожнік! У пасляваенны час было ўзнята пытанне аб стварэнні новага камфартабельнага аўтамабіля павышанай праходнасці. Ідэю яго з'яўлення, дарэчы, прапанаваў сам Мікіта Хрушчоў. Па задуме, машына павінна была выкарыстоўвацца ў якасці службовага аўто сельскіх абкамаў КПСС, старшыняў перадавых калгасаў і — неафіцыйна — як машына для ўрадавых паляўнічых гаспадарак. Гэты незвычайны аўтамабіль не стаў масавым — было выпушчана ўсяго 4677 экзэмпляраў. Дарэчы, існуе кінастужка, на якой Мікіта Хрушчоў і Фідэль Кастра адпраўляюцца на зімовае паляванне менавіта на гэтай машыне.

### ЦЕПЛІЦЦА ЖЫЦЦЁ

Сёння гэтыя легендарныя аўтамабілі, лепшыя гады якіх прыйшліся, на жаль, на вельмі цяжкі час — вайну і аднаўленне пасля яе — здабылі нават не другое і нават не трэцяе жыццё. Сапраўдныя ветэраны аўтамабільнай галіны, яны сышлі на заслужаны адпачынак у цёмныя гаражы, але да гэтага часу іх не пакінулі і не пакінуць запал і энергія матораў-сэрцаў...

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ,**
*в. Заброддзе Вілейскага раёна.*

## ЗАПРАВІЦЦА МОЖНА І З «МАБІЛЫ»

### Assist Belarus падключыў сэрвіс для аплаты паліва з дапамогай мабільнага тэлефона



**Правайдар электронных плацяжоў кампанія Assist Belarus сумесна з Беларусбанкам і прадпрыемствам «Інтэлектуальныя гарадскія сістэмы» рэалізавалі магчымасць аплаты паліва праз мабільную праграму aisDrive для сеткі АЗС «А-100» кампаніі «Астатрэйдынг».**

Як паведаміла прэс-сакратар кампаніі электронных плацяжоў «Асіст» Марына Раман, цяпер трымальнікі плацежных картак могуць аплаціць паліва ў сетцы АЗС не адыходзячы ад аўтазаправачнай калонкі і аўтамабіля праз мабільную праграму aisDrive. Для запраўкі неабходна ўставіць аўтазаправачны пісталет у бак, выбраць АЗС у спісе, націснуць у праграме кнопку «Заправіцца», пазначыць нумар калонкі, колькасць літраў або суму, на якую жадаеце заправіцца, і пацвердзіць аплату. Праграма для запампоўкі даступная ў App Store і Google Play.

У перспектыве плануецца, што гэты сэрвіс будзе карысны аўтааматарам яшчэ і пры аплаце парковачнага месца на стаянцы, магчымай эвакуацыі аўтамабіля ці пры атрыманні спецыяльных зніжак у інтэрнэце і звычайных крамах рознічнага гандлю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ФУТБОЛ З ЗАКРЫТЫМІ ВАЧЫМА,

## або Гульня невідушчых людзей, для якіх няма перашкод

**Футбол — гульня мільёнаў, ён улюбіў у сябе балельшчыкаў больш за сто гадоў таму і працягвае рабіць гэта цяпер. Сёння ж аб'ядноўвае больш за дзвесце краін свету і носіць званне «караля спорту». Для футбола няма абмежаванняў, у яго гуляюць як прафесіяналы, так і аматары, дарослыя і дзеці. Нават сур'ёзныя праблемы са здароўем не спыняюць многіх у жаданні паганяць мяч па полі.**

### ГУЛЬНЯ НА СЛЫХ

Так, у Іспаніі ў 1986 годзе з'явіўся футбол В1. «В» — ад слова blind — сляпы. 1 — першая група інваліднасці. Гэта гульня дазваляе займацца любімай справай людзям, якія з нараджэння альбо па працягу жыцця страцілі зрок. На вачах у гульцоў надзетыя павязкі, унутры мяча — трашчотка, якая выдае гукі пры перамяшчэнні, такім чынам, становішча мяча гульцы вызначаюць толькі па гуку і падказках трэнера і варатара, які, дарэчы, адзіны відушчы гулец у камандзе. Нападаючымі кіруе трэнер, які знаходзіцца за варотамі каманды сапернікаў.

Правілы гэтай катэгорыі футбола заснаваныя на стандартных правілах для класічнага міні-футбола, але ёсць свае асаблівасці. Пры атацы футбалісты крычаць: «Бой!» (у перакладзе з іспанскай — «іду»). Памер поля для гульні складае 40х20 метраў, па ўсім перыметры яно агароджана адмысловымі бартамі, вышынёй 1,3 метра, таму афсайдаў і аўтаў быць не можа.

**Футбол для невідушчых дазваляе не адчуваць сябе абмежаванымі.**

Ёсць свае асаблівасці і для гледачоў футбола невідушчых, ім неабходна вытрымліваць абсалютную цішыню, каб гульцы чулі адзін аднаго, звон мяча і ўказанні трэнераў.

Найбольш папулярны гэты від футбола ў Іспаніі, Англіі, Аргенціне, Францыі і, вядома, Бразіліі. Менавіта бразільцы станавіліся пераможцамі Параалімпіяд 2004, 2008, 2012 і 2016 гадоў. Першая беларуская каманда з'явілася ў 2008-м, на той момант усе гульцы былі аматарамі, гэта значыць, трэніравацца маглі толькі пасля асноўнай работы. Аднак праца спартсменаў і трэнера Алега Кірылава на энтузіязме дала свой плён. У 2016 годзе ў Беларусі футбол для невідушчых ператварыўся ў прафесійны. Цяпер хлопцы трэніруюцца кожны дзень і рэгулярна дэманструюць сваё майстэрства на міжнародных спаборніцтвах, у тым ліку на чэмпіянатах Еўропы.

Для многіх з іх футбол стаў нечым нашмат большым, чым проста гульня. Для людзей, якія маюць фізічныя абмежаванні — гэта магчымасць па-ранейшаму адчуваць сябе паўнавартаснымі, патрэбнымі, сацыяльна адаптаванымі. У камандзе сабраліся вельмі неардынарныя людзі, у коле іх інтарэсаў і іншыя віды спорту, мастацтва і навука.

### ХАЦЕЛАСЯ ЖЫЦЬ

Напрыклад, **капітан нашай зборнай В1 Юрый АРДЫНАЎ** скончыў тэатральнае аддзяленне Віцебскага каледжа мастацтваў, а цяпер працуе на прадпрыемстве з інвалідамі па зроку.

*«Мая пасада — інструктар-метадыст па культурна-масавай і спартыўнай рабоце,* — расказвае Юрый. — *Я займаюся рэабілітацыяй людзей, якія маюць праблемы са зрокам. У маім аддзеле пяць творчых калектываў маюць званне народных. Я і сам выходжу на сцэну, працуем для людзей на святы, для дзяцей і самых работнікаў. Самі пішам музыку да спектакляў, выступаем*



*разам з вядомымі беларускімі артыстамі. Спяваем у стылі «Песняроў», вельмі любім іх творчасць»*.

Праблемы са зрокам Юрыю Ардынаву перадаліся па спадчыне, дыягназ — блізарукасць. Аднак у дзяцінстве гэта не перашкаджала яму гуляць у футбол, у спорце ён з пяці гадоў, слабы зрок дазваляў прыняць мяч на грудзі, зрабіць абводку, ударыць. *«На стадыёне з мячом, як любы хлапчук у нашым дзяцінстве, з раніцы да ночы»*, — з настальгічнай усмешкай адзначае Юрый.

Пасля падзення з ровара ў дзесяцігадовым узросце ў хлопца адбылося адслаенне сятчаткі, адно вока перастала бачыць, гэта не перашкодзіла яму вучыцца ў звычайнай школе, паступіць у каледж. Аднак гуляць у футбол урачы, вядома, забаранілі. У 23 гады такая ж бяда адбылася і з другім вокам, прыйшлося перажыць мноства аперацый. *«Добра, што побач са мной увесь час знаходзіцца вельмі добрыя сябры, бо многія пасля такіх няшчасцяў замыкаюцца ў сабе. А мне хацелася жыць, чагосьці дасягнуць не толькі ў спорце, але і ў жыцці»*.

На шчасце, на шляху ў Юрыя сустрэўся галоўны трэнер зборнай па футболе В1 Алег Кірылаў, ён і прапанаваў яму аднавіць заняткі спортам. У футболе Ардынаў дасягнуў значных поспехаў, на яго талент нават звярнулі ўвагу французы і паспрабавалі пераманіць у сваю зборную, прапанаваўшы ўзяць грамадзянства Францыі.

**У камандзе сабраліся вельмі неардынарныя людзі, у коле іх інтарэсаў і іншыя віды спорту, мастацтва і навука.**

Акрамя футбола Юрый гуляе ў гандбол і тэніс для невідушчых, дзе ўжо паспеў стаць чэмпіёнам Беларусі.

### СПАЧАТКУ ЧАСТА ЛАВІЎ СЦЕНКІ

Яшчэ адзін **гулец зборнай Беларусі Антон ШМЯЛЁЎ** страціў зрок не так даўно, у 2009-м ён пачаў значна пагаршацца, а да 2016-га прапаў цалкам. Антон досыць хутка прайшоў адаптацыю, авалодаў шрыфтам Брайля. Падчас рэабілітацыі пазнаёміўся з чалавекам, які параіў яму




паспрабаваць сябе ў футболе для невідушчых. *«Паспрабаваў. Уцягнуўся. Хутка адаптаваўся, хоць спачатку часта лавіў сценкі. Для мяне самым галоўным было навучыцца самастойна перасоўвацца, самому прыходзіць на трэніроўкі. Паверце, гэта нашмат лепш, чым сядзець у чатырох сценах. Хоць многія, страціўшы зрок, робяць менавіта так. Мне футбол дапамог знайсці сябе пасля трагедыі, хутчэй адаптавацца, працягваць жыццё цікава і насычана»*.

Сёння Антон акрамя футбола праводзіць майстар-класы для студэнтаў Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта. Ён вучыць студэнтаў, як правільна паводзіць сябе з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. *«Галоўнае, чыму я вучу іх, гэта тое, што з інвалідамі паводзіць сябе трэба гэтак жа, як і са звычайнымі людзьмі. Не баяцца, не шкадаваць, а проста падказаць дзесьці, у патрэбны момант даць параду»*.

### КАБ АДАПТАВАЦЦА Ў ФУТБОЛЕ, ТРЭБА КАЛЯ ДВУХ-ТРОХ ГАДОЎ

**Галоўны трэнер зборнай Алег КІРЫЛАЎ** адзначае, што футбол для невідушчых дазваляе не адчуваць сябе абмежаванымі. Дзякуючы спорту ў іх ёсць магчымасць весці актыўны лад жыцця, ставіць перад сабой мэты, падарожнічаць, пазнаваць нешта новае, развівацца.

*«Каб адаптавацца ў футболе, адчуваць прастору, арыентавацца на пляцоўцы, невідушчым гульцам трэба каля двух-трох гадоў. Некаторыя прыходзяць, спрабуюць і сыходзяць, гэта нармальная сітуацыя, але многія і застаюцца,* — расказвае Алег Канстанцінавіч. — *Я сам вырас у сям'і інвалідаў, мне знаёмыя іх праблемы, таму я ўжо шмат гадоў займаюся гэтай справай. Ведаю, што для людзей з такой праблемай, галоўнае, каб побач былі нераўнадушныя людзі»*.



Сёння футбол В1 даступны і для невідушчых дзяцей. Усе ахвотныя могуць звяртацца ў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па параалімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту. Спецыялісты адзначаюць, што займацца спортам важна нават не столькі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, колькі для іх бацькоў. Бо часцей за ўсё менавіта дарослыя заводзяць дзяцей у пэўныя рамкі, агароджваюць ад грамадства і занадта апякуюць, што перашкаджае ім адаптавацца ў грамадстве.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



# ХОД КАРАЛЕВЫ



## Садружнасць нацый зрабіла стаўку на прынца

**Напрыканцы красавіка англійскай каралеве Лізавеце II споўнілася 92 гады, а напярэдадні яна атрымала жаданы падарунак — лідары краін — членаў Садружнасці нацый вырашылі, што наступным кіраўніком арганізацыі стане прынц Чарльз.**

На двухдзённым саміце, які ўпершыню за 32 гады праходзіў у Вялікабрытаніі, каралева сама папрасіла аб гэтым. «Я шчыра жадаю, каб Садружнасць і надалей забяспечвала будучым пакаленням стабільнасць і пераемнасць, а таксама аднойчы вырашыла, што працягнуць распачатую маім бацькам у 1949 годзе работу павінен прынц Чарльз», — заўважыла Лізавета II. Guardian назвала гэтую заяву «незвычайна шчырай», да якой кіраўнікі дзяржаў-удзельніц, вядома, не маглі не прыслухацца. «Аднойчы» наступіла літаральна на наступны дзень, калі было абвешчана (сустрэча прайшла ў зале Ватэрлоа Віндзарскага замка), што Чарльз, прынц Уэльскі, стане пераемнікам Лізаветы II на гэтай пасадзе. Што гэтая падзея значыць для Вялікабрытаніі і для ўсёй Садружнасці?

### Вернасць Кароне

Садружнасць нацый (Commonwealth of Nations) — добраахвотнае аб'яднанне 53 незалежных краін, куды ўваходзяць амаль усе колішнія калоніі, пратэктараты і дамініёны Брытаніі, якія палічылі за лепшае захаваць асаблівыя адносіны з Лонданам. Але ёсць там і краіны, якія ніколі не былі брытанскімі калоніямі, — напрыклад, Руанда і Мазамбік. Гісторыю асацыяцыі адлічваюць з Вестмінстэрскага статута 1931 года, які замацаваў становішча дамініёнаў у складзе імперыі і іх узаемаадносіны з метраполіяй. Пасля таго як Брытанская імперыя страціла 13 амерыканскіх калоній, пакінуўшы за сабой Канаду, Індыю, некаторыя ўладанні ў Вест-Індыі і шэраг раскіданых і аддаленых паселішчаў, у метраполіі намеціліся дзве палітычныя лініі. Першая прадугледжвала арыентацыю на пашырэнне брытанскага ўплыву ў Індыі і на Далёкім Усходзе. Другая лінія, разам з пашырэннем гэтага ўплыву (у інтарэсах брытанскай прамысловасці і ў мэтах эканоміі дзяржаўных расходаў) дапускала развіццё ў калоніях самакіравання, каб прадухіліць паўтарэнне вайны за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній.

Тэрмін «Садружнасць нацый» быў уведзены брытанскім прэм'ер-міністрам лордам Розберы ў 1884-м. Пачатак Садружнасці быў пакладзены праведзенай у 1887 годзе ў Лондане міжнароднай канферэнцыяй, на якой замацаваліся асновы новай каланіяльнай палітыкі: з гэтага часу найбольш развітым калоніям быў падараваны статус дамініёнаў — аўтаномных квазідзяржаўных утварэнняў (пазней — фактычна незалежных дзяржаў), пры гэтым усе яны станавіліся часткай Брытанскай Садружнасці нацый — аб'яднання, што пакліканае аб'яднаць велізарную імперыю. Такімі дамініёнамі сталі Канада, Аўстралійскі Саюз, Новая Зеландыя, Паўднёва-Афрыканскі Саюз, Дамініён Ньюфаўндленд і Ірландыя. На канферэнцыі прэм'ер-міністраў Вялікабрытаніі і брытанскіх уладанняў 1926 года была прынята Дэкларацыя Бальфура, у якой Вялікабрытанія і дамініёны прызналі, што гэтыя дзяржавы маюць «роўны статус і не з'яўляюцца залежнымі адна ад адной». Прававы статус Садружнасці быў замацаваны Вестмінстэрскім статутам ад 11 снежня 1931 года, і аж да 1947-га яно ўяўляла сабой падабенства саюзу дзяржаў, кожная з якіх была аб'яднана з Вялікабрытаніяй асабістай уніяй (кіраўніком дамініёнаў прызнаваўся брытанскі манарх).

З абвяшчэннем Індыі незалежнай рэспублікай у 1947-м арганізацыю прыйшлося рэфармаваць. Яна атрымала сучасную назву «Садружнасць нацый» і засяродзілася на рашэнні перш за ўсё сацыяльна-эканамічных праблем.

### Чвэрць сушы

Першым кіраўніком Садружнасці нацый стаў кароль Георг VI, а пасля яго раптоўнай смерці Лізавета II фактычна атрымала ў спадчыну гэтую пасаду ў 1953 годзе. У цяперашнім выглядзе арганізацыя паўстала ў 1949-м — тады яе членамі былі Брытанія, Індыя, Канада, Аўстралія, ПАР, Пакістан, Шры-Ланка і Новая Зеландыя. Брытанскі манарх юрыдычна лічыцца кіраўніком 16 краін Садружнасці. У шасці дзяржаў ёсць свае манархі: гэта Лесота, Свазіленд, Бруней, Малайзія, Самоа і Тонга. Аднак сярод членаў арганізацыі большасць краін — рэспублікі.



Дзяржавы Садружнасці займаюць чвэрць сусветнай сушы. Самыя буйныя па плошчы з іх — гэта Індыя і Канада, сярод самых маленькіх — астраўныя дзяржавы ў Ціхім акіяне (Науру, Самоа, Тувалу, Вануату), а таксама Дамініка, Антыгуа і Барбуда ў Карыбскім рэгіёне. Краіны-ўдзельніцы Садружнасці размешчаны па ўсім свеце — у Афрыцы, Азіі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, Еўропе і Ціхаакіянскім рэгіёне. Усе члены маюць роўнае права голасу незалежна ад памеру і эканамічнага росту. Прадстаўнікі краін-членаў фарміруюць палітыку і прыярытэты дзейнасці Садружнасці. Кожныя два гады яны сустракаюцца, каб абмеркаваць усе надзённыя пытанні.

Цяпер у Садружнасці пражываюць 2,4 мільярда чалавек. Большасці з іх яшчэ не споўнілася 30 гадоў. Насельніцтва планеты пры гэтым складае 7,4 млрд. Самая густанаселеная краіна Садружнасці — Індыя, на якую прыпадае каля паловы насельніцтва 53 краін. Арганізацыя ў мінулым губляла членаў. У 2003 годзе прэзідэнт Зімбабвэ Роберт Мугабэ спыніў сяброўства ў супольнасці пасля таго, як яно было прыпынена з-за падазрэнняў у махлярстве на выбарах. Між тым падчас апошняга саміту брытанскі ўрад агучыў гатоўнасць зноў прыняць у шэрагі членаў Садружнасці гэтую афрыканскую рэспубліку. Міністр замежных спраў Брытаніі Борыс Джонсан сказаў, што Зімбабвэ «дамаглася ўражальных вынікаў» пад кіраўніцтвам пераемніка Мугабэ Эмерсана Мнангагвы, аднак трэба дачакацца правядзення «свабодных і сумленных выбараў» у ліпені.

У 1999 годзе, пасля ваеннага перавароту ў Пакістане, членства гэтай краіны ў Садружнасці было прыпынена, а праз чатыры гады — аднаўлена. У 1961 годзе з супольнасці выйшла ПАР, пасля таго як іншыя краіны раскрытыкавалі яе за палітыку апартэіду. У 1994 годзе гэтая краіна зноў увайшла ў Садружнасць. Гамбія выйшла з арганізацыі ў 2013-м, назваўшы яе «неакаланіяльным інстытутам». Апошнімі па часе з супольнасці выйшлі Мальдывы, гэта адбылося ў 2016 годзе.



Цяперашні статут прадугледжвае прыхільнасць членаў Садружнасці 16 ідэям, сярод якіх дэмакратыя, роўнасць полаў, устойлівае развіццё, мір і міжнародная бяспека. Садружнасць крытыкуюць, называючы «посткаланіяльным клубам» і арганізацыяй з вельмі абмежаваным уплывам. Прыхільнікі Садружнасці кажуць, што яе члены атрымліваюць дапамогу ў развіцці і саюзнікаў на сусветнай арэне. «Члены нашай арганізацыі аддаsucc ідэі развіцця і абароны дэмакратыі, эканамічнага развіцця і павагі да разнастайнасці», — перакanana генеральны сакратар Садружнасці Патрыцыя Скотланд (дарэчы, ураджэнка Дамінікі, якая вырасла ў Вялікабрытаніі).

### Трон у спадчыну

Пасада кіраўніка аб'яднання — не тытул, ён не перадаецца ў спадчыну. Традыцыйна яе займае брытанскі манарх, якога фармальна прызначаюць на пасаду лідары краін-удзельніц. Асноўны абавязак — аб'ядноўваць удзельнікаў, наладжваць паміж імі гандлёвыя сувязі і іншыя віды супрацоўніцтва. Для гэтага кіраўнік пастаянна ездзіць па краінах аб'яднання і асабіста сустракаецца з іх лідарамі.

У лютым 2018 года журналісты BBC паведамілі пра тое, што Садружнасць сфарміравала спецыяльную «групу высокага ўзроўню», каб вырашыць праблему перадачы паўнамоцтваў ад Лізаветы II пераемніку. Заява каралевы зняла многія пытанні. Больш за тое, яна справакавала новую хвалю дыскусій у Вялікабрытаніі аб тым, хто атрымае ўспадчыну трон. Брытанская прэса разглядае заяву Лізаветы II на саміце ў Лондане як магчымы этап перадачы паўнамоцтваў менавіта Чарльзу. «Каралева публічна падтрымала прынца Чарльза як будучага кіраўніка Садружнасці — і пачынае згортваць свае паўнамоцтвы», — азагаловіла матэрыял брытанская The Telegraph. «Яе (Лізаветы II) словы далі ясна зразумець, што прапапераемнасць Чарльза ў гэтай працы — што ніколі не гарантавалася і часам нават выклікала сумненне, — зараз вырашанае пытанне», — піша The Times. У сваю чаргу, таблоід The Sun расцэньвае такі крок як працяг падрыхтоўкі да магчымага адмаўлення ад пасады на карысць Чарльза. Яшчэ ўлетку 2017 года The Daily Mail паведаміла пра тое, што каралева ўсур'ёз разглядае магчымасць адмовіцца ад кароны пасля дасягнення 95 гадоў і перадаць трон.

69-гадовы прынц Уэльскі — першы ў чарзе на брытанскую карону. Аднак у апошнія гады ў мясцовых СМІ неаднойчы выказваліся здагадкі, што каралева можа перадаць трон наступнаму фармальнаму прэтэндэнту — свайму ўнуку прынцу Уільяму, старэйшаму сыну прынца Чарльза і прынцэсы Дыяны. На яго баку сімпатыі большасці брытанцаў. Згодна з нядаўнімі апытаннямі YouGov, 56 % рэспандэнтаў хацелі б бачыць Уільяма наступным каралём (13 % — у прынца Чарльза), а 78 % апытаных пераканания, што старэйшы ўнук каралевы аказвае пазітыўны ўплыў на манархію (толькі 36 % згодныя з такім жа сцвярджэннем пра яго бацьку).

### Напярэдадні «брэксіту»

Вядома ж, стратэгічным застаецца эканамічны фактар. Сумарны ВУП супольнасці складае 10 трыльёнаў долараў. Сярод тэм для абмеркавання на апошнім саміце быў міжнародны гандаль. Кіраўнікі дзяржаў пагадзіліся «змагацца з пратэкцыянізмам» з мэтай давесці абарот гандлю паміж краінамі Садружнасці да $2 трлн да 2030 года. Арганізацыя — важны гандлёвы партнёр Лондана: каля 8,9 % брытанскага экспарту і прыкладна 7,8 % імпарту прыпадаюць на яе ўдзельнікаў. Вялікабрытанія — самы эканамічна развіты член Садружнасці (прынамсі пакуль). Неўзабаве — магчыма ўжо налета — яе абгоніць Індыя. Невыпадкова, што падчас сустрэчы з Тэрэзай Мэй індыйскі прэм'ер Нарэндра Модзі (які ўзяў удзел у саміце) заявіў, што пасля выхаду з ЕС гэтая краіна будзе настолькі ж важнай для Індыі, як і цяпер, перадае Reuters. Акрамя таго, ён дадаў, што «брэксіт» прапануе яшчэ больш магчымасцяў для павышэння гандлёвых адносін паміж Лонданам і Нью-Дэлі. «Ён сказаў, што Лондан быў вельмі важны для Індыі дзякуючы доступу да сусветных рынкаў», — паведаміла прэс-сакратар кіраўніка брытанскага ўрада.

На фоне выхаду Вялікабрытаніі з Еўрасаюза прыхільнікі «брэксіту» заўважаюць, што Садружнасць павінна набыць большае значэнне. «Яны разлічваюць на новыя гандлёвыя дамовы і на тое, што са змяненнем заканадаўства аб памежным кантролі, мігрантаў, якія прыбываюць праз ЕС, заменяць выхадцы з краін супольнасці», — паведаміў Euronews. Пры гэтым застаецца адкрытым і пытанне наконт узбуйнення арганізацыі. Напрыклад, як заявіла міністр замежных спраў Аўстраліі Джулія Бішап у інтэрв'ю газеце The Australian, гэтая краіна падзяляе зацікаўленасць Вялікабрытаніі ў пашырэнні Садружнасці за кошт прыняцця ў яе склад дзяржаў, якія ў мінулым не былі брытанскімі калоніямі. Так што пры ўсіх цяперашніх супярэчнасцях супольнасць застаецца на зайздрасць жыццяздольнай.

**Захар БУРАК.**

# ЖУРАВІНКА, ЛІЛЕЯ, ПЕРШАЦВЕТ...

## ВЫБІРАЕМ БЕЛАРУСКІЯ САРТЫ БУЛЬБЫ

**На жаль, цяжка прадбачыць, якім будзе гэты агародны сезон, але, калі ўлічыць парады вучоных, можна вырасціць добры ўраджай, нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е.**



— Пры вырошчванні бульбы трэба прытрымлівацца традыцыйных патрабаванняў. Так, садзіць яе трэба, калі тэмпература глебы вышэй за сем градусаў, яна павінна прагрэцца на глыбіню пяць сантыметраў і болей. Сёлета зямля ў многіх раёнах пераўвільготненая. Спорныя дажджы былі ўвосень і вясной, ды зімой дастаткова падсыпала снегу. І зараз водныя запасы даволі нядрэнныя. Гэта вельмі добра для сельскай гаспадаркі. Будзе вільгаць — будзе і ўраджай, — упэўнены **загадчык лабараторый тэхналогій вытворчасці і захоўвання бульбы Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Дзмітрый ФІЦУРА.**

***— Што павінен улічыць гаспадар, у якога на ўчастку лішак вады?***

— Калі глеба пераўвільготненая, лепш пачакаць. Пры магчымасці адвесці ваду па баразнах. Абавязкова рабіць градкі — тады глеба будзе хутчэй прасыхаць, прагравацца.

Вельмі важна, каб зямля прасохла. Калі паспяшацца з пасадкай на сырых участках, можна сутыкнуцца з рознымі праблемамі — найперш гэта загніванне клубняў, развіццё хвароб. А калі бульбу пасадзіць у халоднае надвор'е, можа праявіцца рызактаніёз. А ў гэтыя цёплыя майскія дні трэба паскорыць пасадку бульбы.

***— Як зразумець, што гэта хвароба ёсць на ўчастку?***

— На парастках з'яўляюцца язвы, пашкоджанні карычневага, чорнага колеру. Ідзе тармажэнне, пашкоджанне ўсходаў, яны не дружныя.

***— І што варта зрабіць, каб папярэдзіць такую бяду?***

— Трэба праграваць клубні перад пасадкай — на балконе, на верандзе, у хляве высыпаць на салому, там, куды трапляе рассеянае святло, патрымаць на сонцы. І сёння многія выкарыстоўваюць такі добры агратэхнічны прыём для загартоўвання бульбы перад пасадкай. Калі ёсць магчымасць, добра азеляніць пасадачны матэрыял. Клубні павінны быць сухія, з вочкамі, якія ўжо прарастаюць. Парасткі могуць быць каля пяці міліметраў. Калі яны даўжэйшыя, трэба быць асцярожнымі, каб не абламаць іх пры пасадцы.

І, зразумела, трэба правесці нарэзку зямлі, прычым градкі рабіць хоць бы за 2-3 дні перад пасадкай. Яны ствараюцца акучнікам (зараз людзі карыстаюцца малагабарытнай тэхнікай: рознымі культыватарамі, мотаблокамі, мінітрактарамі), калі ж гэтага няма — матыкай.

Калі глеба лёгкая, можна садзіць бульбу на глыбіню да 10 см. А калі больш звязная, суглінак — 6-8 см. У перыяд вегетацыі мы рэкамендуем рабіць адну-дзве міжрадковыя апрацоўкі. Калі ўсходы дружныя, можна зрабіць адну апрацоўку, каб стварыць больш высокую градку. Так задаюцца добрыя ўмовы для фарміравання ўраджаю, адначасова праводзіцца барацьба з пустазеллем. Акрамя таго, пры акучванні ўсходаў ідзе і абарона клубняў новага ўраджаю ад фітафтарозу.

***— Калі людзі садзяць бульбу на новым участку, дзе доўга нічога не вырошчвалася, адкуль там з'яўляецца фітафтора?***

— Інфекцыя пераносіцца ветрам, пры дажджы споры змываюцца з ліста на глебу, а пасля пранікаюць углыб на клубні. Таксама ў зямлі могуць быць шкодныя мікраарганізмы, многа штамаў паршы, розных гніляў, захворванняў.

***— А як засцерагчы бульбу ад паршы?***

— Лепш за ўсё выбіраць сарты, устойлівыя да паршы. Іх даволі многа: Скарб, Брыз, Палац, Лель, Журавінка, Вектар, Волат. Парша праяўляецца ў засушлівае надвор'е. І, каб пазбегнуць яе, трэба праводзіць арашэнне. Асабліва важна, каб зямля не была сухой у чэрвені, пачатку ліпеня, калі пачынаецца цвіценне, ідзе фарміраванне клубняў. І хоць бульба — культура спёка- і засухаўстойлівая, у такі час яна патрабавальная да вільгаці. Калі яе паліваць, лепш будуць завязвацца клубні.

***— Сёння мала гавораць пра альтанарыёз, але зараз ён не менш агрэсіўны, чым фітафтора. Як адрозніваць гэтыя захворванні?***

— З пацяпленнем клімату альтанарыёз становіцца даволі распаўсюджаным і шкодным захворваннем для бульбы. Калі надвор'е сухое і спякотнае, альтанарыёз з'яўляецца нават раней, чым фітафтароз. Хоць у адзін з гадоў апошні быў зафіксаваны нават у канцы мая ў прыватным сектары. У фітафтарозу мучністы (белы, «ватны») налёт на тыльным баку ліста. Пры альтанарыёзе вы заўважыце на ліставой пласціцы канцэнтрычныя кругі карычневага колеру. У фітафтарозу ёсць дзве формы: сцябловая і ліставая. Альтанарыёз, як правіла, пашкоджвае лісты, а пасля пераходзіць на сцябло. У мэтах прафілактыкі фітафтарозу мы рэкамендуем праводзіць апераджальныя апрацоўкі пры вышыні раслін каля 20 сантыметраў. Ёсць даволі эфектыўныя кантактна-сістэмныя прэпараты, якія абараняюць расліну і звонку, і знутры. Трэба толькі своечасова праводзіць апрацоўкі, каб паміж імі не было вялікіх інтэрвалаў, і пачынаць абарону да таго, як хвароба з'явіцца на расліне. Калі ўпусціць дзень-два, фітафтора можа праявіцца, пачаць распаўсюджвацца, і яе цяжка ўтрымаць. А вось супраць альтанарыёзу, на жаль, прэпаратаў не так многа, і яны недастаткова эфектыўныя.

***— Як хутчэй атрымаць ураджай?***

— Зразумела, укрыццё спанбондам — гэта дадатковыя выдаткі. Каб хутчэй атрымаць маладую бульбу, самае простае, што можна параіць, — прарошчванне, праграванне і пасадка ў раннія аптымальныя тэрміны. Важна вызначыцца з пасадачным матэрыялам (можна парэкамендаваць раннія сарты Палац, Маніфест, з навінак — Першацвет). Калі вы робіце ўсё, каб хутчэй атрымаць новы ўраджай, ёсць вялікая верагоднасць пазбегання фітафтарозу. Гэта хвароба не такая страшная для ранніх сартоў. Але мы назіралі, што раннія сарты недастаткова ўстойлівыя да фітафторы. І калі лета вільготнае, моцныя дажджы і туманы, яна можа праявіцца.



Рагнеда.



Лілея.



Журавінка.



Здабытак.

***— Прэпараты накшталт «экасілу» паскараюць рост бульбы?***

— Падобныя прэпараты — гэта імунамадулятары, стымулятары з фунгіцыдным дзеяннем, яны могуць даваць абарончы эфект пры неспрыяльных умовах надвор'я. Трэба сказаць, што пры добрым забеспячэнні вільгаццю і элементамі сілкавання расліны больш здаровыя і ўстойлівыя да інфекцый. Зразумела, такая агародніна развіваецца хутчэй, чым тая, што хварэе.

***— Чым «падкарміць» бульбу?***

— Мы рэкамендуем абавязкова ўносіць для балансу гумусу ў глебе мінімальную колькасць арганікі — 15 тон (а лепей і 20) на гектар. Калі няма гною, трэба па магчымасці шукаць іншыя крыніцы арганічнай сыравіны — тое ж апалае лісце, з пустазелля рабіць кампост. Калі і такога няма, патрэбны мінеральныя ўгнаенні. Мы рэкамендуем уносіць азот (да 120 кг на гектар), фосфар (хоць бы 40—60 кілаграмаў), калій (120—180 кілаграмаў). У перыяд вегетацыі неабходна рабіць пазакаранёвыя падкормкі, разводзіць у вадзе карбамід (з разліку на гектар 2-3 кілаграмы), дадаваць мікраэлементы: бор, медзь, марганец.

***— А як атрымаць экалагічна чыстую прадукцыю?***

— Трэба весці падбор сартоў, устойлівых да хвароб, перш за ўсё фітафтарозу. Так, з ранніх сартоў — гэта Лілея, з сярэдняпозніх Рагнеда, Здабытак, Волат, Атлант, Акцэнт. Можна карыстацца біялагічнымі прэпаратамі. Напрыклад, адзін з такіх «Ксантрэл» (распрацоўка Інстытута мікрабіялогіі) прымяняецца і супраць каларадскага жука, і супраць фітафтарозу. У барацьбе з фітафторай дапамогуць «Бактафіт», «Фітаспарын». Але трэба ўлічваць, што такія прэпараты неабходна рэгулярна выкарыстоўваць, калі надвор'е спрыяе развіццю хвароб.

***— Сёння гаспадары ўсё часцей гавораць пра пасадкі ў салому. Як вы ставіцеся да падобных парад?***

— Салома ці сена — матэрыял для мульчыравання глебы, так ствараецца мікраклімат для фарміравання і развіцця клубняў, а яшчэ — гэта і барацьба з пустазеллем. Але эксперыменты з саломай — гэта больш справа аматараў. На жаль, у вытворчасці мы гэта не прымяняем і не даследуем, бо такія падыходы малавераГодныя для масавага ўкаранення і тым больш прамысловага (гаспадаркі вырошчваюць бульбу на плошчах у 200—400, а часам і каля тысячы гектараў).



**«Асабліва важна, каб зямля не была сухой у чэрвені, пачатку ліпеня, калі пачынаецца цвіценне, ідзе фарміраванне клубняў. І хоць бульба — культура спёка- і засухаўстойлівая, у такі час яна патрабавальная да вільгаці. Калі яе паліваць, лепш будуць завязвацца клубні».**

***— Калі вегетацыйны перыяд зноў будзе такім дажджлівым, як у мінулым годзе, што можна зрабіць, каб не страціць ураджай?***

— Мы праводзім даследаванні па ўстойлівасці сартоў да пераўвільгатнення і засухі. Затапляем расліны бульбы ў розныя фазы (бутанізацыі, цвіцення і перад высыпаннем). Асабліва бульба адчувальная да пераўвільгатнення ў фазу бутанізацыі. Калі вада стаіць на пасадках некалькі дзён, яны моцна пашкоджваюцца. Бывае, ураджай істотна губляецца ці наогул гіне. Па магчымасці трэба старацца адводзіць ваду. Рабіць пасадкі на больш высокіх месцах.

***— Што варта зрабіць, каб бульба добра захоўвалася?***

— Пажадана капаць бульбу ў сонечнае надвор'е ці ў час, калі няма дажджоў. А калі ліе многа дзён запар, хоць бы выбраць «фортачку», калі дождж спыніўся. Гэта вельмі важна. Тады хоць пры выкапцы клубняў іх не залье зверху. Выбраную вільготную бульбу можна перанесці пад навес, каб прасохла. Тады яна можа і паляжаць...

Калі ж ураджай вы ўбралі ў дождж і паклалі бульбу мокрай, захаваць яе будзе праблематычна.

***— Падкормкі могуць спрыяць таму, што бульба будзе ляжаць доўга?***

— Лічыцца, што борныя ўгнаенні ўплываюць на трываласць лупіны клубня, збалансаванае сілкаванне важна для фарміравання ўраджаю і нармальнага захоўвання. А вось пры лішку азотных угнаенняў могуць быць праблемы. Азот павялічвае перыяд вегетацыі, магчыма і пагаршэнне лёжкасці клубняў. Трэба ўмець абыходзіцца з угнаеннямі. Калі бацвінне слабае (бывае, што глеба бедная), рэкамендуецца праводзіць падкормку азотнымі ўгнаеннямі. Трэба рабіць гэта да перыяду цвіцення, а пасля дадатковыя падкормкі праводзіць не варта. Бацвінне, як правіла, да гэтага часу добра развіта, мы больш яго топчам.

***— Ці з'явіцца ў нас на сталах фіялетавая бульба?***

— Сёння аматары цікавяцца такімі сартамі, і, магчыма, з цягам часу падобная прадукцыя зойме пэўную нішу. Вучонымі вядзецца актыўная работа па стварэнні бульбы з каляровай мякаццю. Ужо маем многа ўзораў з рознымі адценнямі ружовага, фіялетавага, чырвонага, ёсць і варыянты з украпінамі жоўтага колеру. Я бачыў, якія атрымліваюцца чыпсы з такой бульбы, — знешне вельмі нагадваюць каўбасу. Каляровая бульба падыдзе для прыгатавання салатаў, гарніраў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Узденский районный исполнительный комитет 14 июня 2018 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельных участков

На аукционные торги выставляются участки:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Нач. цена (бел. руб.) | Расх. по подготовке (кроме расх. на публ. извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Партизанская | 0,0064 | 625650100003001635 | 311,11 | 73,50 | |
| 2 | Узденский райисполком | г. Узда, б-р Дзержинского | 0,0034 | 625650100003001457 | 190,38 | 73,50 | |
| 3 | Узденский райисполком | Узденский р-н, в районе д. Великая Уса | 0,4445 | 625684200009000005 | 2 978,97 | 2 520,36 | Охранных зон: реки Уса, линий связи и радиофикации, в придорожных полосах автомобильных дорог |

Целевое назначение лота № 1 и № 2 – для установки и обслуживания торгового павильона, лота № 3 – для строительства и обслуживания производственного объекта.

Имеется возможность подключения к водоснабжению и электроснабжению.

Срок аренды лота № 1 и 2 – 20 лет, лота № 3 – 50 лет.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предъявить:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• копии документов, подтверждающих внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

• копию документа заявителя, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта) покупателя или его доверенного лица;

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, а также копии документов о государственной регистрации ИП, юридического лица, копии учредительных документов, представителем или уполномоченным должностным лицом – нотариально удостоверенная доверенность (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 53738).

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002 платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, по рабочим дням с 14 мая по 8 июня 2018 года включительно с 8.00 до 17.00 (кабинет № 206).

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии двух и более участников аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам 8(01718) 65404, 54705.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 206 и по телефону (801718) 53738.

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства объекта (ул. Большая Троицкая) в городе Гродно 29 мая 2018 года

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Гродно ул. Большая Троицкая между домами № 39 и № 33 и домом № 12 по ул. 1-ая Трудовая | 0,1421 | Административно-торговый объект | 26 855,83 | 2 685,58 | 3 423,7 | Снос зданий, сооружений, зеленых насаждений, попадающих под пятно застройки | 38 786,13 |

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Гродно, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

**Аукцион состоится 29 мая 2018 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

